

«ГЕНСЕКА» РАЗУМЕЮЦЬ З ПАЎСЛОВА... **8**

ШУКАЛЬНІК СКАРБАЎ... ПАД СУЗОР'ЕМ НАДЗЕІ **13**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЧЭРВЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 116 (29485)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Сёння на сусветных рынках перамагаюць інавацыйныя тавары. Прарыўныя бізнес-праекты інавацыйнага тыпу задаюць больш паскораны вектар эканамічнага развіцця. Нават пры захаванні за Беларуссю іміджу прамысловай дзяржавы з класічнымі прадпрыемствамі мы можам удасканальваць напрацоўкі, укараняць іх у вытворчасць і прасоўваць на рынках інавацыйныя віды прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю. Тыя ж тэхналогіі 3D-прататыпіравання, мадэлявання, дызайну, сучасныя метады маркетынгу і многае іншае. Урад нацэлены на стварэнне ўмоў для эфектыўнай работы па ўсіх франтах: гэта і вытворчасць якаснага, інавацыйнага, унікальнага прадукту і забеспячэнне яго рэалізацыі».*

# Пакуль жывём — мы помнім



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

22 чэрвеня ў гісторыі Беларусі — жалобная дата. 80 гадоў таму жыццё мільёнаў людзей падзялілася на «да» і «пасля» і ўжо ніколі не стала ранейшым. Беларусь, як ніякая іншая краіна, спазнала на сабе ўвесь жах «новага парадку», які прынеслі з сабой фашысты. І заплаціла вельмі вялікую цану — страціла кожнага трэцяга. Невыпадкова 22 чэрвеня ў нас — Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

Сёння па ўсёй краіне пройдзе Усебеларуская хвіліна маўчання. Прыняць удзел у ёй можа кожны. У 12.00 трэба спыніцца, каб успомніць... І падумаць.

## КОРАТКА

• **Парк высокіх тэхналогій выпусціў электронны даведнік «IT-абітурыент-2021». У выданні прадстаўлена актуальная і падрабязная інфармацыя аб IT-факультэтах мінскіх і рэгіянальных універсітэтаў.**

• Кінастудыя «Беларусьфільм» пачала здымкі ігравога фільма «Полымя пад попелам».

• **Арганізатары Гульняў у Токіа ўстанавілі ліміт заўзятараў на трыбунах.**

• Выстава «Зруйнаваныя надзеі» да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны адкрыецца 22 чэрвеня ў Мінску.

Блізкая ўлада

## КАБ ВАДА — НЕ БЯДА, А ДАРОГА — НЕ ТРЫВОГА

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей падчас правядзення кожнай прамой тэлефоннай лініі для жыхароў Гомельшчыны прымае да паўсотні званкоў ад грамадзян з розных куткоў рэгіёна. Прамыя лініі губернатара традыцыйна атрымліваюцца «гарачымі»: уздымаюцца пытанні будаўніцтва дарог, аднаўлення камунікацый, якасці вады, працаўладкавання, падтрымкі фермерскіх гаспадарак, просяць людзі рады і ў вырашэнні зямельных спрэчак, выступаюць з канструктыўнымі прапановамі. Часта звяртаюцца, каб выказаць удзячнасць за работу кіраўніцтва рэгіёна і мясцовых улад.**

Журналісты, якія таксама прысутнічаюць на «гарачых лініях» і асвятляюць гэтую работу, не раз цікавіліся ў кіраўніка рэгіёна яго меркаваннем наконт эфектыўнасці работы па тэлефонных зваротах. У яго выпрацаваны свой падыход: чалавек заяўляе пра праблему, Генадзь Салавей слухае і, застаючыся на тэлефоне, па другой лініі дае даручэнне разабрацца ў праблеме тым кіраўнікам, у чыёй яна кампетэнцыі. Камунальныя аварыі, напрыклад, выпраўляюцца ў лічаныя гадзіны.

— Калі праблема вырашальная, рэакцыя павінна быць імгненнай, — лічыць Генадзь Салавей. — Але часам рашэнне таго ці іншага хвалюючага нашых жыхароў пытання патрабуе дадатковага вывучэння і разгляду. Людзі шукаюць дапамогі не толькі ў сваім рэгіёне, звяртаюцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта, іншыя органы. Але ў раёнах усё можна вырашыць больш аператыўна. Менавіта мясцовыя ўлады павінны забяспечыць камфорт людзей у зоне іх пражывання.

**СТАР. 7**

Размова па сутнасці

## УРОКІ 1941-га: 80 ГАДОЎ ТАМУ І СЁННЯ

Як захаваць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне і не дапусціць паўтарэння трагедыі?

**Ужо амаль восем дзесяцігоддзяў наша краіна не ведае, што такое вайна. Аднак чым далей адыходзяць тыя падзеі, тым больш імкліва навязваюцца «новыя» варыянты гісторыі Вялікай Айчыннай. Больш за тое, у нас, нашчадкаў тых, хто цаной уласнага жыцця выратаваў свет ад фашысцкай навалы, спрабуюць адабраць галоўную святыню — Перамогу. Сёння мы як ніколі ў адказе за праўду аб вайне. За памяць, якую павінны захаваць, каб урокі 1941-га, якія ў сувязі з апошнімі ваенна-палітычнымі падзеямі з'яўляюцца надзвычай актуальнымі сёння, ні нам, ні іншым пакаленням беларусаў больш ніколі не давялося перажыць.**

**СТАР. 4–5**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе**

**Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Урач і настаўнік — гэта люстэрка любой дзяржавы»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка напярэдадні Дня медыка, у суботу, наведаў 2-ю дзіцячую клінічную бальніцу Мінска. Кіраўнік краіны заслухаў даклад галоўнага ўрача Ларысы Сячко аб стане спраў ва ўстанове, азнаёміўся з дзейнасцю некалькіх аддзяленняў клінікі. Пасля медыкі задалі Прэзідэнту свае пытанні. Нагодай для сустрэчы ў клініцы стала не толькі прафесійнае свята, але і юбілей дзіцячай «двойкі». Яна адкрылася 19 чэрвеня 70 гадоў таму.**

Кіраўнік дзяржавы наведаў некалькі аддзяленняў бальніцы, рэанімацыю, школу цукровага дыябету і ізатопную лабараторыю, азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай установы. Прэзідэнт таксама пагутарыў з маленькімі пацыентамі і іх бацькамі і ўручыў дзецям падарункі.

Пасля знаёмства з дзейнасцю дзіцячай бальніцы Аляксандр Лукашэнка паразмаўляў з медыкамі. «Урач і настаўнік — гэта люстэрка любой дзяржавы, будзьце вартыя гэтага звання. Не дапускайце, каб белыя халаты сталі «бруднымі». Вы разумееце мой намёк, — сказаў Прэзідэнт. — Я жадаю вам заставацца стрыжнем нашага грамадства, такімі мужнымі людзьмі, якімі мы вас бачым».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў медыкам за адданую працу падчас пандэміі, калі яны ў пачатку, нават не зважаючы на сваю бяспеку, кідаліся лячыць хворых.

«Вы беражыце самі сябе, таму што ад вашага здароўя залежыць здароўе ўсіх нас, нашага грамадства. І, як мы сёння пераканаліся, шмат людзей з-за мяжы да вас едуць лячыцца — значыць, вы нам патрэбны здаровымі», — сцвярджае Прэзідэнт.

Першае пытанне да Прэзідэнта датычылася дыспансерызацыі. Медык прапанавала ўнесці ў заканадаўства норму, якая б абавязала працадаўцу даваць адзін выхадны дзень супрацоўніку для праходжання медыцынскага абследавання.

«Мы падумаем над гэтым пытаннем. Мы ведаем вопыт многіх краін, у тым ліку і Расіі, калі кіраўнікі арганізацыі, прадпрыемства дае чалавеку, калі ён дамовіўся правесці дыспансерызацыю, выхадны дзень», — сказаў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка краіны, нашы людзі часам не зусім уважліва ставяцца да свайго здароўя, бо спадзяюцца на бясплатную медыцыну.

«Тое, што неабходна абавязаць кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый клапаціцца аб здароўі сваіх працоўных, — гэта дакладна. Будзе гэта аплачаны ці неаплачаны дзень, мы вырашым. Але тое, што ён будзе, дакладна», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Наступнае пытанне ад урачоў пра вакцынацыю: ці стане яна ў нашай краіне абавязковай?

«Дзякуй Богу, такой неабходнасці пакуль няма. Я пераконваю за расіян, масквічоў, бо ў іх кажуць пра ўспышку. Дай Бог, каб гэта была ўспышка, бо яна выбухне і пагасне, а калі пад'ём захваральнасці — гэта надоўга», — сцвярджае Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, у Беларусі з Расіяй значна аднавіліся транспартныя зносіны, таму неабходна ўважліва ставіцца да сітуацыі ў суседняй краіне і нам.

«І тое, што ў нас на гэтым фоне, мяне неяк насцярожвае. Я кіраўніку Адміністрацыі кажу: «Арганізуйце праз тыдзень нараду ў Прэзідэнта, каб мне далажылі, што адбываецца ў ахове здароўя. Да ўсяго трэба рыхтавацца загадзя». Праз тыдзень вернемся да гэтага пытання ў плане абмеркавання праблем аховы здароўя ў Мінску», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён працягнуў, што не хацеў бы ўвядзення абавязковай вакцынацыі, але рэкамендуе прышчапіцца ўрачам, гандлёвым супрацоўнікам, аптэкарам — тым, хто мае шчыльны кантакт з людзьмі.

«У мяне, як і ў вас, ёсць сумненні ў плане гэтай вакцыны, але я зыходжу з таго, што горш не будзе. Мы пакуль настойліва рэкамендуем прышчапіцца», — сказаў кіраўнік краіны.

Наконт беларускай вакцыны ён паведаміў, што не спяшаецца з гэтай справай — пакуль ствараем вакцыну па расійскіх тэхналогіях, закупляем у КНР.

«Мы не будзем спяшацца, а ў будучым годзе створым сваю вакцыну, ужо апрабаваную. Гэтая ж зараза муціруе, і невядома, які штам віруса будзе налета. Мы хочам сваю вакцыну падвесці да таго штаму віруса», — заяўляе кіраўнік краіны.

Пацікавіліся медыкі і грамадскімі пытаннямі: якімі будуць транспартныя зносіны для выезду за мяжу для адпачынку.

Паводле меркавання Прэзідэнта, лепш адпачываць на радзіме. Калі хтосьці мае патрэбу адправіцца ў іншыя краіны, беларусы без праблем вылятаюць у Расію, Грузію.

«Што датычыцца Турцыі. Вы бачыце, як брыдка паступіла Украіна, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Яны закрылі нам палёты. Нам даводзіцца ў хвілін 40—45 рабіць круг, аблятаючы іх, каб трапіць у Турцыю ці Егіпет. Турэцкія авіякампаніі пакуль напрамую лятаюць. Але мы зараз вядзём дыялог, калі Украіна нам закрыла пралёты, то мы з Украіны не будзем прымаць самалёты. Неабходна стварыць роўныя ўмовы для нашых самалётаў. Калі мы гэтым шляхам ляцім, то мы прымусім і іншых лётаць гэтым шляхам да нас у Беларусь».

Па яго словах, калі беларусы захочуць паехаць у іншыя краіны, то іх будуць дастаўляць расійскія авіяліні праз Маскву. Але Прэзідэнт вельмі рэкамендуе пабыць летам на Айчыне.

На заканчэнне сустрэчы Прэзідэнт і медыкі абмяняліся падарункамі. Галоўны ўрач падарыла кнігу пра гісторыю бальніцы, дзе змешчана распараджэнне Прэзідэнта 1996 года аб развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы. Яшчэ адзін прэзент для кіраўніка краіны — яго фотаздымак з маленькімі пацыентамі бальніцы, зроблены падчас першага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў дзіцячую «двойку» ў 1995 годзе. Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч таксама падарыў Прэзідэнту кнігу, дзе апісваюцца ўсе візіты кіраўніка краіны ў «чырвоныя» зоны падчас пандэміі каранавіруса.

Прэзідэнт падарыў медыкам сертыфікат на апарат ультрагукавой дыягностыкі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пашынян сфарміруе ўрад Арменіі

**Партыя в. а. прэм'ер-міністра Арменіі Нікола Пашыняна «Грамадзянскі дагавор» перамагае на парламенцкіх выбарах у Арменіі. Партыя можа прэтэндаваць на 54 % мандатаў, што дазволіць ёй самастойна сфарміраваць урад.**

У парламент таксама праходзяць блок экс-прэзідэнта Роберта Качарана «Арменія» і экс-прэзідэнта Сержа Саргсяна «Гонар маю». Палітолагі мяркуюць, што такі зыход галасавання тлумачыцца тым, што выбаршчыкі галасавалі не столькі за Пашыняна, колькі супраць былых лідараў краіны.

У адпаведнасці з канстытуцыяй Арменіі, калі пасля размеркавання мандатаў у вышэйшым заканадаўчым органе ні адна з сіл не набярэ 54 %, то ва ўсіх партый, згодна з Выбарчым кодэксам, будзе шэсць дзён, каб сфарміраваць кааліцыйны ўрад.

Як адзначыў кіраўнік ЦВК Арменіі Тыгран Мукучан, Пашынян набраў дастаткова галасоў, каб фарміраваць урад самастойна. Разам з тым, з'явіліся паведамленні, паводле якіх партыя Пашыняна не зможа сфарміраваць урад, паколькі ёй для гэтага не хапае 0,08 %. Аднак, як падкрэслілі ў армянскім ЦВК, гэта не зусім так.

### Патэнцыйна небяспечны астэроід зблізіцца з Зямлёй 25 чэрвеня

**NASA на сваіх рэсурсах папярэдзіла аб тым, што 25 чэрвеня побач з Зямлёй праляціць астэроід памерам з дзве статуі Свабоды, піша газета Daily Express.**

Гаворка ідзе пра астэроід 2010 NY65, даўжыня якога, згодна з разлікамі астрафізікаў, складае каля 187 м. Нябеснае цела ўпершыню было выяўлена ў ліпені 2010 года, з таго часу за ім вялося назіранне. У найбліжэйшым да Зямлі пункце аб'ект будзе знаходзіцца ад нашай планеты прыкладна ў 5,8 млн км — на адлегласці, якая больш чым у 15 разоў перавышае адлегласць ад Зямлі да Месяца.

У NASA лічаць гэтую адлегласць дастаткова блізкай, каб называць цела калязямным і патэнцыйна небяспечным. Хоць апошняе не гарантуе катастрафічнага сутыкнення, існуюць фактары, якія могуць змяніць яго шлях. Так, выпадковыя астэроіды ўразаліся ў Зямлю мільёны гадоў таму, паколькі на іх паўплывала гравітацыйнае прыцягненне нашай планеты.

У цэнтры ўвагі

# МОЛАДЗЬ БЕЛАРУСІ: РЭАЛІІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

**У Беларусі стартаваў Тыдзень моладзі. Ён папярэднічае Дню моладзі, які будзе адзначацца ў нашай краіне ў апошнюю нядзелю чэрвеня. Пра гэта падчас круглага стала ў прэс-цэнтры БелТА паведаміў намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.**

«Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у Беларусі пражывае каля 1,7 млн маладых людзей, гэта амаль кожны пяты жыхар краіны. Таму пры вызначэнні агульнанацыянальных прыярытэтаў у нашай краіне абавязкова ўлічваюцца інтарэсы моладзі як найбольш актыўнай часткі грамадства, — падкрэсліў намеснік міністра. — На фінансаванне мерапрыемстваў падпраграмы «Маладзёжная палітыка» дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2021—2025 гады будзе накіравана 10 млн рублёў».

«Беларусь — краіна таленавітых людзей. У нас створаны ўсе ўмовы, каб адораная моладзь магла сябе рэалізаваць. З 1996 года дзейнічае спецыяльны фонд Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. За 25 гадоў яго дзейнасці было заахвочана каля 40 тысяч навучэнцаў і студэнтаў, больш за чатыры тысячы педагагічных і навуковых работнікаў. У банк даных адоранай моладзі ўключана інфармацыя аб 6260 грамадзянах», — падкрэсліў Аляксандр Кадлубай.

Цэнтральнай падзеяй Тыдня моладзі стане адкрыты дыялог «Моладзь Беларусі: рэаліі і перспектывы», які пройдзе на базе Нацыянальнай бібліятэкі 24 чэрвеня. Пра гэта паведаміў падчас круглага стала **другі сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ.**

«Адкрытаму дыялогу папярэднічала абмеркаванне пытанняў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі на розных дыялогавых пляцоўках, у тым ліку на форумах «Беларусь — гэта мы!». Прапановы збіраліся, абагульняліся, у тым ліку і для распрацоўкі праекта стратэгіі развіцця БРСМ на найбліжэйшую перспектыву», — праінфармаваў Аляксандр Прохараў.

Адкрыты дыялог «Моладзь Беларусі: рэаліі і перспектывы» пройдзе афлайн і анлайн з удзелам рэгіёнаў. На яго запрошаны прадстаўнікі парламента, міністэрстваў і ведамстваў, якія займаюцца маладзёжнай палітыкай, кіраўнікі структурных падраздзяленняў Саюза моладзі, усе грамадскія арганізацыі патрыятычнай накіраванасці, з якімі Саюз моладзі падпісаў мемарандум, пераможцы і прызёры праектаў БРСМ, прадстаўнікі студэнцкіх атрадаў, маладзёжных атрадаў аховы правапарадку. Будзе арганізаваны і буккросінг, на якім прадставяць тэматычную літаратуру, выпушчаную як у Беларусі, так і за яе межамі, а таксама атрыманую ў дар ад партнёраў.

Аляксандр Прохараў дадаў: «Каб у далейшым пачутыя ідэі, думкі, прапановы і інавацыі ўпарадкаваць, структураваць і надаць ім юрыдычны статус, БРСМ і Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Беларусі падчас дыялогу падпішуць пагадненне аб супрацоўніцтве».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Пяскі» — месца смутку

**У Полацку на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Урочышча «Пяскі» адбылася духоўна-патрыятычная акцыя «Памяццю і смуткам свет пераможа вайну».**

Яна была арганізавана Беларускім фондам міру сумесна з Полацкім раённым выканаўчым камітэтам і Беларускай праваслаўнай царквой. У якасці ганаровага госця ў мерапрыемстве ўзяў удзел **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** Дарэчы, парламентарыі таксама ахвяроўвалі грошы на стварэнне мемарыяла. А дэпутат пятага і шостага склікання Наталля Гуйвік увекавечанне памяці тых, хто знайшоў свой апошні спачын у Пясках, лічыла адной з галоўных сваіх спраў падчас работы ў прадстаўнічым органе ўлады.

Год таму мемарыял быў адкрыты. «Звязда» таксама дапамагала рэалізаваць ідэю яго стварэння. У яе нумарах, пачынаючы з 2013 года, у рамках сумеснага з грамадскасцю Полаччыны праекта «Урочышча Пяскі», рэгулярна публікаваліся артыкулы з расповедамі пра гэта трагічнае месца і пра тое, як ажыццяўляецца ідэя ўсталявання помніка.

Месца памяці знаходзіцца на ўскраіне горада, дзе ў 1941—1944 гадах немцы стварылі перасыльны лагер «Дулаг-125» для ваеннапалонных. Вязні знаходзіліся ў жудасных умовах. Ад голаду і хвароб штодня паміралі да двухсот чалавек. Па некаторых ацэнках, за гады акупацыі Полацка ў гэтым пекле памерла не менш за сорак тысяч палонных. Ёсць меркаванне, што ў месцы, дзе цяпер мемарыял, можа ляжаць да 150 тысяч чалавек. Тут таксама расстрэльвалі падпольшчыкаў, партызан і мірных жыхароў.

Дзясяткі гадоў урочышча заставалася без належнага ўшанавання. Ледзь прыкрытыя пяском парэшткі размывалі дажджы. У 65-ю гадавіну Перамогі прынялі рашэнне аб стварэнні мемарыяльнага комплексу. Цяпер гэта месца, дзе праводзяцца гарадскія патрыятычныя акцыі.

Спікер парламента Уладзімір Андрэйчанка, выступаючы на тэрыторыі комплексу перад палачанамі і гасцямі горада, падкрэсліў неабходнасць памяці пра падзеі вайны. Павага да гістарычнай праўды — гэта і магчымасць пабудаваць светлую будучыню. Полацкі мемарыял нагадвае пра страшную трагедыю, пра якую нельга забыць, гэта напамін пра спробу знішчыць беларускі народ, пра яго прыняжэнні, сказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

На акцыі прысутнічала каля пяцісот чалавек розных узростаў. Былі запрошаны дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, прадстаўнікі органаў улады, кіраўнікі ўсіх рэлігійных канфесій, прадстаўнікі арганізацый і грамадзяне, якія зрабілі вялікі ўнёсак у будаўніцтва мемарыяла.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЖЫЦЬ І ПОМНІЦЬ

## У Брэсце праходзяць мерапрыемствы да Дня памяці і смутку

**Памятныя мерапрыемствы пачаліся раніцай у нядзелю на пляцоўцы каля кінатэатра «Беларусь» вызной акцыяй «Жыць, каб памятаць». Яе зладзіў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Да 80-годдзя пачатку гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці прымеркаваная філатэлістычная выстава, якая адкрылася ў грамадска-культурным цэнтры ў гэты ж дзень.**



Фота БелТА.

Патрыятычныя і відовішчныя акцыі адбыліся ў панядзелак, у іх ліку — «Эстафета сцяга «Перамога». Сцяг Усерасійскай патрыятычнай акцыі, прысвечанай Вялікай Перамозе, расійскія госці перадалі дырэктару мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Рыгору Бысюку. Зараз сцяг будзе захоўвацца ў музеі Брэсцкай крэпасці.

Па традыцыі пад вечар 21-га шмат людзей сышлося да кінатэатра «Беларусь». Сюды завіталі і ўдзельнікі аўтапрабегу Брэст — Іркуцк — Брэст. Адсюль у 17 гадзін стартавала традыцыйная імпрэза «Мірны вечар на Савецкай». Рэканструктары з дапамогай касцюмаў эпохі 40-х паспрабавалі аднавіць атмасферу часу, прайшлі па пешаходнай Савецкай. Паўсюль на гарадскіх пляцоўках ладзіліся канцэрты духавой музыкі, песень і твораў ваенных гадоў.

Каля Холмскіх варот крэпасці Інстытут пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь правёў акцыю памяці «Баявы разлік». Мерапрыемства вось ужо шосты раз ладзіцца каля сцен Брэсцкай крэпасці ў гонар герояў-пагранічнікаў, тых, хто 21 чэрвеня 1941-га ў 19 гадзін прайшоў рытуал прызначэння на ахову дзяржаўнай граніцы — баявы разлік, які аказаўся апошнім. Бо ў першыя ж хвіліны вайны ў бой з праціўнікам уступілі байцы пагранічных нарадаў. І, нягледзячы на тое, што падраздзяленням германскай арміі на захоп кожнай з застаў адводзілася гадзіна, нашы вартавыя граніцы трымаліся многія гадзіны, нават дні. Абараняліся да апошняга байца альбо апошняга патрона.

Гэта ў іх гонар, а таксама ў гонар усіх пагранічнікаў, якія загінулі ў гады вайны, на плошчы перад помнікам героям граніцы выстраіліся курсанты Інстытута пагранічнай службы з партрэтамі байцоў Беларускай пагранічнай акругі. Пачалася пераклічка:

— Начальнік 9-й заставы 105-га пагранатрада Іларыён Сямёнавіч Аляксееў!

— Кулямётчык 1-й заставы 17-га пагранатрада чырвонаармеец Міхаіл Васілевіч Андрыянаў!

— Начальнік 9-й заставы 17-га пагранатрада герой Савецкага Саюза Андрэй Мітрафанавіч Кіжаватаў!..

І адказ у кожным выпадку быў аднолькавы: «Паў смерцю храбрых за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы».

Калі ж акцыя з партрэтамі скончылася, 18-19-гадовыя курсанты па камандзе строем прамаршыравалі па брукаванцы крэпасці ў адкрытыя Холмскія вароты, так, як іх равеснікі ішлі ў далёкім 1941-м, каб стаць на шляху ворага. Яны пайшлі ў бяссмерце і сталі памяццю. А сэнс баявога разліку ў тым, каб падкрэсліць, што іх подзвіг, самаахвярнасць і мужнасць не забытыя.

22 чэрвеня па шматгадовай традыцыі пройдзе мітынг-рэквіем. Гэтая акцыя пачынаецца ў 3.30 на плошчы Цырымаміялаў і плаўна перацякае ў вялікую ваенна-гістарычную рэканструкцыю абароны Брэсцкай крэпасці. Летась рэканструкцыю адмянілі з-за пандэміі. Сёлета ў Брэст прыехалі многія клубы рэканструктараў.

* * *

У канферэнц-зале музея абароны Брэсцкай крэпасці адбылася прэзентацыя альбома «Подзвіг савецкага народа бессмяротны: новыя экспазіцыі «Брэсцкай крэпасці-героя» і Музея Перамогі на Паклоннай гары ў Маскве», які выйшаў у выдавецкім доме «Звязда» пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

**Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ,** адкрываючы прэзентацыю, адзначыў глыбокі сімвалізм месца яе правядзення — на зямлі Брэсцкай крэпасці. Ён сказаў, што Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы на працягу шэрагу гадоў падтрымлівае выданне кніг гісторыка-патрыятычнай накіраванасці і назваў новую кнігу вынікам душэўнага парыву музейшчыкаў, навукоўцаў, якія падштурхоўваюць нас да роздуму.

**Дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Рыгор БЫСЮК** нагадаў, што менавіта дзякуючы бюджэту Саюзнай дзяржавы за тры гады рэалізаваны праект «Капітальны рамонт, рэстаўрацыя і музеефікацыя збудаванняў Брэсцкай крэпасці». У ходзе праекта выканана 17 мерапрыемстваў па рамонце, кансервацыі аб'ектаў і стварэнні трох новых экспазіцый.

Самым урачыстым момантам прэзентацыі стала перадача Дзмітрыем Мезенцавым Рыгору Бысюку згаданай кнігі на захаванне ў музеях крэпасці. Пры гэтым Дзяржсакратар паведаміў, што першыя экзэмпляры выдання перададзены Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку і Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну ў знак пашаны за вялікую работу па захаванні гістарычнай праўды аб вайне.

Усе прысутныя на мерапрыемстве ўбачылі асаблівую логіку ў тым, што прэзентацыя альбома плаўна перацякла ў круглы стол расійскіх і беларускіх журналістаў, навукоўцаў, музейшчыкаў на тэму «Вялікая Айчынная вайна: захаванне гістарычнай памяці — маральны абавязак пакаленняў».

**Міністр інфармацыі РБ Уладзімір ПЯРЦОЎ** зачытаў прывітальны адрас ад **Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі КАЧАНАВАЙ.** «Няхай увесь свет ведае, што для народаў Беларусі і Расіі гісторыя Вялікай Айчыннай вайны заўсёды будзе сімвалам гордасці і яднання», — гаворыцца ў адрасе.

У фармаце відэазвароту прагучалі прывітальныя словы ад **памочніка прэзідэнта Расіі Уладзіміра МЯДЗІНСКАГА і дырэктара Службы знешняй разведкі, старшыні Расійскага гістарычнага таварыства Сяргея НАРЫШКІНА.** У абодвух выпадках удзельнікам канферэнцыі пажадалі плённай работы. У сваіх выступленнях на круглым стале навукоўцы і практыкі засярodзілі ўвагу на самых розных аспектах захавання гістарычнай памяці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Надвор'е

# Спякота перамагае

## З серады да пятніцы тэмпературныя максімумы будуць дасягаць 33—36 цяпла

**Неяк перад пачаткам лета нашы асобныя спецыялісты паспрабавалі спрагназаваць надвор'е больш чым на тыдзень. У іх атрымлівалася, што ў чэрвені будзе даволі дажджліва і не асабліва цёпла. Аказалася, прагноз — так сабе. Гарачае паветра ўжо цяпер перашкаджае дыхаць на поўныя грудзі, а што будзе заўтра?**

Выключна гарачае надвор'е захаваецца ў нашай краіне да канца тыдня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У гэтыя дні эксперты прадракаюць нам не мяккі пачатак лета, а сапраўдную афрыканскую спёку. У нашым рэгіёне даждж0ў будзе няшмат, а чэрвеньскае сонца працягне бязлітасна паліць. Так атрымалася, што тэмпературны фон за 20 чэрвеня ўжо на 6—10 градусаў перавысіў кліматычную норму, а асноўная спякота яшчэ наперадзе. Не прыносяць вялікай палёгкі і ночы, бо слупкі тэрмометраў ніжэй плюс 15—21 не апускаюцца, а з узыходам сонца паветра настолькі інтэнсіўна награваецца, што ўжо да 8—9 раніцы, як правіла, тэмпературны фон па краіне перавышае 25 градусаў цяпла.

Вось і сёння ўдзень толькі месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы, максімальная тэмпература паветра будзе ад плюс 29 градусаў да 34 цяпла, месцамі па паўднёвым усходзе — да плюс 35 градусаў. Заўтра, у сераду, кароткачасовыя дажджы чакаюцца ў асобных раёнах заходняга рэгіёна нашай краіны. Месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер будзе паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 17 градусаў да 22. Удзень у гарадах магчымы «парніковы эфект»: паветра прагрэецца да 29—34 цяпла, месцамі да плюс 35—36 градусаў.

Днём выпрабаванняў будзе чацвер і пятніца. Праўда, месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя, але досыць сур'ёзныя дажджы, часам навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 17—23 градусы. Удзень — 25—32 цяпла, па ўсходзе плюс 33—36 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у суботу спякота паволі стане выдыхацца, калі за трыццаць будзе толькі месцамі. У гэты дзень пройдуць кароткачасовыя дажджы, чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 16—23 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 22—28 градусаў, па ўсходзе — да 29—32 цяпла.

Па падліках нашых спецыялістаў, сапраўды «адпусціць» гарачыня толькі ў нядзелю.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Страты

# Ракавое сэлфі

**У райцэнтры Докшыцы ў ноч на панядзелак загінула 22-гадовая дзяўчына ў выніку спробы сфатаграфавацца ў фантане.**

У Віцебскім абласным упраўленні МНС пацвердзілі, што ноччу 21 чэрвеня атрымалі званок па тэлефоне «101», заяўнік паведаміў, што дзяўчыну б'е токам у фантане, а спробы дапамагчы ёй завяршаюцца няўдала. Электрычная энергія забяспечвае падачу вады і асвятленне ў фантанах, пры гэтым у іх прадугледжана сістэма бяспекі. Электрычнасць разам з вадой — гэта заўсёды патэнцыйная небяспека, звяртаюць увагу ратавальнікі.

Супрацоўнікі МНС выехалі на выклік, у дыэлектрычных пальчатках адключылі падачу току, дасталі з вады дзяўчыну, на жаль, без прыкмет жыцця, і перадалі яе медыкам.

Паводле слоў **афіцыйнага прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці Аксаны ЛАЗЬКО,** вядзецца расследаванне абставін трагедыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ТРАГЕДЫІ НА ВАДЗЕ

## За выхадныя на вадаёмах загінулі 30 чалавек, у тым ліку двое дзяцей

**Па аператыўных даных Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах, за перыяд з 14 да 20 чэрвеня патанулі 39 чалавек, чатыры з іх былі непаўналетнімі.**

У Аршанскім раёне Віцебскай вобласці загінуў 15-гадовы хлопчык: як потым высветлілася, ён не ўмеў плаваць. У Гомельскай вобласці 13-гадовы падлетак сказаў бабулі, што паедзе з сябрамі гуляць, насамрэч трапіў на вадаём, з якога ўжо не вярнуўся. У Магілёўскай вобласці патанула 15-гадовая дзяўчынка: гуляючы з сабакам, яна спатыкнулася і ўпала ў ваду. У Шклове на рацэ Днепр загінуў дзевяцігадовы хлопчык. Абставіны і прычыны надзвычайных здарэнняў высвятляюцца.

— Прычынай трагедый на вадаёмах сярод непаўналетніх з'яўляецца той факт, што бацькі не сочаць за месцазнаходжаннем сваіх дзяцей, — адзначыў **начальнік выратавальна-ратавальнай службы Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах Дзмітрый БАРАНОЎСКІ.** — Дзеці альбо гуляюць самі, альбо пакінуты на бабуль і дзядуль, якія з улікам свайго ўзросту не могуць прадбачыць наступствы магчымых трагедый. Яшчэ раз звяртаемся да бацькоў: сачыце за сваімі дзецьмі! Тады ў нас не будзе такой жудаснай статыстыкі.

Асноўнай прычынай гібелі на вадзе дарослых па-ранейшаму застаецца алкаголь. Акрамя таго, трагедыі здараюцца з-за таго, што людзі, у тым ліку ў стане алкагольнага ап'янення, купаюцца ў непрыстасаваных для гэтага месцах.

Нягледзячы на такую сумную статыстыку, трагедый магло б быць яшчэ больш. За гэты ж перыяд (з 14 да 20 чэрвеня) выратавана 35 чалавек, у тым ліку 13 дзяцей. Аб небяспецы папярэджана звыш тысячы чалавек, у тым ліку каля 300 непаўналетніх. Усяго з пачатку года патанулі 144 чалавекі, у тым ліку 18 непаўналетніх. Выратавана 134 чалавекі, з якіх 32 — дзеці.

Як паведаміў **памочнік міністра — прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ,** у аператыўных зводках — людзі рознага ўзросту, узроўню дастатку і рознага стаўлення да жыцця. «Следчыя і эксперты ўстановяць дакладныя прычыны ўсіх трагедый, але вельмі часта нават слоў відавочцаў дастаткова, каб зразумець, якім чынам маглі развівацца падзеі: ужыванне алкаголю, жаданне паказаць уласную годнасць і выдатныя фізічныя магчымасці, грэбаванне элементарнымі мерамі бяспекі, — перакананы афіцыйны прадстаўнік МНС. — Мы неаднаразова нагадвалі і нагадваем: купанне на неабсталяваных пляжах небяспечна! Ужываць алкаголь, няхай і ў маленькіх дозах, падчас адпачынку — недапушчальна! Дзяцей ні на хвіліну нельга пакідаць без нагляду! Калі нехта тоне, трэба неадкладна тэлефанаваць ратавальнікам па нумарах 101 або 112».

**Вераніка КАНЮТА.**

# УРОКІ 1941-га:

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб у чарговы раз даць адпор фальсіфікатарам і псеўдагісторыкам, абмеркаваць шляхі захавання і перадачы агульнай гістарычнай памяці, напярэдадні 80-й гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў рэдакцыі газеты «Звязда» прайшоў круглы стол «Урокі 1941-га: 80 гадоў таму і сёння». У ім узялі ўдзел **дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі Узброеных Сіл Беларусі Сяргей АЗАРОНАК, начальнік упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Міністэрства абароны Сяргей ВАРАНОВІЧ, кандыдат гістарычных навук Наталля ГОЛУБЕВА, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ірына ДАЎГАЛА, акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук, член-карэспандэнт, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр КАВАЛЕНЯ.**

***«ЗВЯЗДА»: — Напад гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз 22 чэрвеня 1941 года для савецкага кіраўніцтва не быў нечаканасцю — гэта ўжо дакументальна пацверджаны факт. Чаму на працягу доўгага часу транслюецца іншы пункт гледжання? Ці можна было пазбегнуць тых вялікіх чалавечых і рэсурсных страт, якія зафіксаваны ў пачатку вайны?***

**Наталля ГОЛУБЕВА:** — Лепш за Георгія Канстанцінавіча Жукава на гэтае пытанне яшчэ ніхто не змог адказаць. Згадаем унікальны дакумент пад грыфам «абсалютна сакрэтна», які быў рассакрэчаны толькі 19 мая 1956 года. Жукаў накіроўвае ў ЦК партыі праект свайго выступлення на маючым адбыцца Пленуме ЦК пасля 20-га з'езду партыі, дзе ён на 18-ці старонках шчыра, без усялякіх перабольшанняў, выкладвае памылкі пачатку вайны, звязаныя не столькі з падрыхтоўкай арміі, узбраення, па колькасці якое, дарэчы, не саступала нямецкай арміі. Жукаў па паліцах расклаў усе памылкі кіраўніцтва. Дакумент унікальны, і супрацьстаяць яму складана.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Давялося асабіста працаваць з шэрагам дакументаў, якія даказваюць факт, што вайна была прадказальная. Шмат цікавых дэталяў, што ўказваюць на непазбежны пачатак вайны, утрымлівае асабістае данясенне Панамарэнкі Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму. Актыўна ішло пераўзбраенне Чырвонай Арміі, аднак у першыя дні вайны нам не ўдалося разгрупаваць авіяцыю, якую мы амаль страцілі. Танкавыя падраздзяленні таксама часткова былі знішчаны. У Брэсце аказалася замкнёная вялікая групоўка нашых войскаў, якая павінна была выйсці на абарону граніцы, аднак амаль уся загінула. Такіх вялікіх страт можна было б пазбегнуць, калі б хоць на некалькі дзён раней прыйшла тая дырэктыва, якую Цімашэнка з Жукавым «выбілі» ў Сталіна. Мы б не страцілі вялікі мабілізацыйны рэсурс — людзей, якія павінны былі ўзяць зброю і, паспеўшы правесці баявое зладжванне, стаць на абарону Айчыны...

***«ЗВЯЗДА»: — У Беларусі ўжо ў першыя дні вайны пачалі разгортвацца калабарацыйныя сілы. Спробы дэстабілізаваць абстаноўку назіраліся яшчэ напярэдадні Вялікай Айчыннай...***

**Наталля ГОЛУБЕВА:** — Падрыхтоўка да вайны ішла не толькі ў ваенным плане. Нашымі працўнікамі рыхтавалася магутная ідэалагічная зброя. Успомнім 1937 год. Стаўка Абверам зроблена на беларускую эміграцыю. Быў падрыхтаваны план выкарыстання беларусаў замежжа супраць СССР. Матыў — нацыянальнае адраджэнне. Мы ведаем імёны тых, на каго і ў Беларусі была зроблена стаўка: Гадлеўскі, Акінчыц і іншыя. Хтосьці з беларусаў быў прыняты на работу ў Міністэрства прапаганды Гебельса. У гарадах Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі былі створаны беларускія прадстаўніцтвы. Праводзім аналогіі з сучаснымі падзеямі: сёння моцнай апорай апазіцыі, на жаль, таксама стала частка беларускага замежжа, арганізоўваюцца прадстаўніцтвы, прымаюцца звароты, якія нават пераклікаюцца з тымі, якія распрацоўваліся пад кіраўніцтвам нямецкіх ідэолагаў. Рыхтавалася магутная ідэалагічная база для ўварвання на тэрыторыю СССР, у прыватнасці, у Беларусь. Рупарам становіцца газета «Раніца», якая выдавалася за нямецкія грошы ў Германіі і ажыццяўляла фінансаванне дзейнасці правадыроў нацыянальнага адраджэння — Васіля Захаркі, Ларысы Геніюш і іншых. І апошні штрых у аналогіі: як рабіліся правадыры? Май месяц, 1928 год, у Германіі адбываюцца выбары ў Бундэстаг. Партыя Гітлера займае дзявятае месца, атрымлівае 2,6 % галасоў. Нікому не вядомая партыя, Гітлер, якога апісвалі як чалавека «з бруднымі тлустымі валасамі і адзінымі прашараванымі штанамі», праз год становіцца рэспектабельным чалавекам. Партыя праводзіць буйны з'езд, і самае галоўнае, у ланцугі выстройваюцца дзяўчаты ў белым адзенні, махаюць кветкамі і вітаюць Гітлера. Вам гэта нічога не нагадвае?! Што адбылося з Гітлерам? Рэспектабельны, вымыты, жыве на віле свайго сябра Эрнста Ганфштэнгеля, які хутка прыбыў з Амерыкі. У навяўленага правадыра з'явіліся куратары, партыя становіцца магутнай. Увесь гэты фарс выліўся ў трагедыю. Таму, абапіраючыся на гістарычныя прыклады і аналогіі, наша сённяшняя задача — не дапусціць паўтору трагедыі ў сваёй краіне.

**Ірына ДАЎГАЛА:** — У дактрыне 1943 года Алена Далеса, які нават падумаць не мог, з якой хуткасцю сёння будзе распаўсюджвацца інфармацыя і адбывацца «прамыванне» свядомасці, робіцца акцэнт на моладзь. «Літаратура, тэатры, кіно — усё гэта будзе паказваць і праслаўляць самыя нізкія чалавечыя пачуцці. Мы будзем усяляк падтрымліваць і падымаць так званых мастакоў, якія стануць навязваць і ўдзёўбваць у чалавечую свядомасць культ сексу, гвалту, садызму, здрадніцтва — усялякай амаральнасці. І ў дзяржкіраванні мы пасеем хаос і блытаніну». Падобнае мы сёння бачым і на інтэрнэт-рэсурсах, у якіх сядзяць нашы дзеці. Той самы TikTok нам яшчэ адгукнецца....

***«ЗВЯЗДА»: — Аднак тэма калабарацыі доўгі час замоўчвалася айчыннай гістарыяграфіяй. Ці не з'яўляюцца наступствамі гэтага маўчання жніўвеньскія падзеі, якія адбываліся ў нашай краіне?***

**Наталля ГОЛУБЕВА:** У нас ёсць дакладны дакумент 1946 года — вынікі Нюрнбергскага працэсу, дзе прапісана, што калабарацыя — злачынная дзейнасць. І прапісана, што рашэнне аб лёсе калабарантаў прымае кожная канкрэтная дзяржава. Згадаць тую ж Бельгію. Маленькая краіна, з насельніцтвам у 4,5 мільёна, за калабарантскую дзейнасць адразу асудзіла 100 тысяч чалавек, тысячу з іх расстралялі. Францыя пазбавіла грамадзянства ўсіх, хто супрацоўнічаў з фашыстамі. У нас прайшлі паказальныя працэсы над тымі, у каго была кроў на руках, астатнія адбылі розныя тэрміны пакарання. Але колькі мы хавалі здраднікаў Хатыні, не ўздымалі пытанне літоўскіх, латышскіх карнікаў, каб нікога не пакрыўдзіць, не ствараць напружанасці ў грамадстве? Хоць у той жа Латвіі з трох мільёнаў насельніцтва 150 тысяч праваявалі на фашыстаў. Сёння іх узвялі ў ранг герояў. Памяркоўнасць, талерантнасць не заўсёды ідуць на карысць.



Сяргей АЗАРОНАК.



Сяргей ВАРАНОВІЧ.



Наталля ГОЛУБЕВА.

Існуе вядомая фраза: «Гісторыя паўтараецца спачатку як трагедыя, затым — як фарс». Праводзячы аналогіі з чэрвенем 1941-га, пачаткам 1990-х і тым, што адбылося ў нас ужо ў 2020-м годзе, — гэта тыя ключавыя падзеі, ад якіх мы адштурхоўваемся, каб зрабіць шматпланавыя высновы: пачынаючы з юрыдычнага пункту гледжання, заканчваючы ідэалагічным, маральным, культурным аспектамі. Чаму наша, здавалася б, абсалютна стабільная краіна, якая прайшла ўнікальны 30-гадовы шлях будаўніцтва незалежнай дзяржавы, апынулася перад шэрагам складаных праблем? Усё паўтараецца: у нашых суседніх краінах, якія спрабуюць ціснуць на нас, трагедыя вайны і гады мірнага будаўніцтва, на жаль, становяцца фарсам — дыскрэдытуецца паняцце патрыятызму, подзвігу, навязваецца іншы пункт гледжання аб героях, якія перамаглі ў крывавай вайне. І тут вельмі важны ідэалагічны аспект. Ідэалогія — самы дакладны кірунак дзейнасці. Як толькі з'яўляецца нейкі люфт у нашай свядомасці, ён імгненна запаўняецца здагадкамі, у аснове якіх, на жаль, не заўсёды падмуркам становіцца канкрэтны дакумент, гістарычны факт, і, што самае небяспечнае, часта нават гістарычныя факты проста выцясняюцца з кантэксту падзей, скажаючы іх. Таму шмат тлумачэнняў па спрэчных пытаннях аб сімвалах, калабарацыі і іншых. Гэтым карыстаюцца тыя, каму стабільнасць не даспадобы. А тэхналогіі ўплыву на свядомасць людзей старыя, як свет. І калі ўспомніць, як пачыналася падрыхтоўка да Вялікай Айчыннай вайны і як адбываліся мінулагоднія падзеі, наўрад ці мы адшукаем нешта новае. Усё ў гісторыі паўтараецца. Толькі мы не заўсёды робім высновы...

***«ЗВЯЗДА»: — Фальсіфікацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны, наўмыснае скажэнне гістарычных фактаў, прыніжэнне ролі савецкага народа ў перамозе над гітлераўскай Германіяй — актуаліі, якім апошнім часам вымушана процістаяць беларуская грамадскасць...***

**Ірына ДАЎГАЛА:** — Мы сёння з болем успрымаем трагедыю дзіцячага канцлагера ў Чырвоным Беразе, што ў Жлобінскім раёне. Вядома, што ён быў перасыльны, адтуль адпраўлялі дзяцей у Саласпілскі лагер. А што сёння кажуць у Латвіі? Што гэта быў лагер працоўнага навучання. Гісторыю ўжо перапісалі. І новая версія гістарычнага месца ўжо навязваецца сучаснаму пакаленню латвійцаў, якое ўзводзіць фашыстаў ледзь не ў ранг вызваліцеляў.

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ:** — Як вядаць, некаторыя палітычныя сілы Еўропы, асабліва маладаеўрапейцы, імкнуцца перапісаць Нюрнберг, дзе быў вынесены прысуд тым, хто распальваў вайну. Па сутнасці, гэта рэвізія вынікаў Другой сусветнай вайны, робіцца чарговая спроба рэабілітаваць сапраўдных вінаватых і памагатых у развязванні сусветнай вайны. Нагадаем, што менавіта палітычныя эліты краін-падпісантаў гэтай рэзалюцыі выступілі на баку нацызму і бралі актыўны ўдзел у баявых дзеяннях, знішчалі мірнае насельніцтва, палілі вёскі, руйнавалі мірнае жыццё савецкіх людзей. Сёння неабходна нагадваць еўрапейцам, што ў ваенным паходзе супраць СССР разам з Германіяй выступілі Венгрыя, Румынія, Фінляндыя, Славакія, Італія. Іх войскі налічвалі каля 870 тысяч чалавек, 42 разліковыя дывізіі, звыш 6600 гармат і мінамётаў, 400 танкаў і 960 самалётаў. Усяго на баку Германіі ваявала каля двух мільёнаў чалавек з 15 краін Еўропы. Прычым многія з іх з'яўляліся добраахвотнікамі, з якіх былі створаны нацыянальныя фарміраванні. Дарэчы, многія з іх пакінулі чорны след на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, удзельнічаючы ў знішчэнні беларускага народа.

На жаль, у наш час робіцца шмат, каб дыскрэдытаваць Вялікую Перамогу савецкага народа над нацысцкай Германіяй. Разгорнута нябачаная раней фальсіфікацыя ваенных падзей, з'явілася нямала «шукальнікаў праўды», якія імкнуцца выяўляць і адкрываць толькі негатыўныя факты ваеннай гісторыі, перабольшваючы, а то і выдумляючы і падтасоўваючы розныя падзеі і факты, ствараючы небыліцы. Калі раней асобныя, найбольш агрэсіўныя антысаветчыкі, спрабавалі абвінавачваць Савецкі Саюз у распальванні Другой сусветнай вайны, то сёння прымаюцца адпаведныя рэзалюцыі на міждзяржаўным узроўні. Вядома, што Парламенцкая асамблея Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ), якая праходзіла ў Вільнюсе з 29 чэрвеня да 3 ліпеня 2009 года, прыняла дэкларацыю «Уз'яднанне падзеленай Еўропы: заахвочванне правоў чалавека і грамадзянскіх свабод у рэгіёне АБСЕ ў XXI стагоддзі», у якой еўрапарламентарыі заклікалі аб'явіць 23 жніўня днём агульнаеўрапейскай памяці ахвяр сталінізму і нацызму. Аднак на гэтым палітычныя лідары Еўрасаюза не спыніліся. Праз дзесяць гадоў, 19 верасня 2019 года, Еўрапейскі парламент зноў прыняў рэзалюцыю, у якой падкрэслівалася, што «80 гадоў таму, 23 жніўня 1939 года, камуністычны Савецкі Саюз і нацысцкая Германія падпісалі Дагавор аб ненападзенні, вядомы як Пакт Молатава-Рыбентропа, і яго сакрэтныя пратаколы, падзяліўшы Еўропу і тэрыторыі незалежных дзяржаў паміж двума таталітарнымі рэжымамі і згрупаваўшы іх у сферы інтарэсаў, што падрыхтавала грунт для пачатку Другой сусветнай вайны».

***«ЗВЯЗДА»: — Атрымліваецца, што праўда аб мінулай вайне ўжо асабліва нікому, акрамя нас, не патрэбная. Мы ў адказе не толькі за яе захаванне, але і за захаванне гістарычнай памяці аб ёй, бо без памяці не будзе і праўды. Якім чынам гэта зрабіць у сучасных рэаліях, калі многія памятаць пра вайну не хочуць, а жывых сведак таго жаху з кожным годам становіцца менш?***

**Наталля ГОЛУБЕВА:** — У сярэдзіне 1980-х гадоў Усесаюзны Савет ветэранаў выступіў з ініцыятывай аб стварэнні кнігі «Памяць», над якой працавала амаль уся краіна. Пачынаючы ад кожнай сельскай школы, усе пісалі гісторыю сваіх герояў Вялікай Айчыннай вайны, гісторыю сваіх дзядоў, бабуляў, сваіх населеных пунктаў. Чаму б цяпер не зрабіць кнігу памяці суверэннай беларускай незалежнай дзяржавы?! Кнігу, якая ўскалыхнула б усю краіну, уключыла б у агульную справу ўсіх — ад малога да вялікага. А расказаць нам ёсць пра што.

**Сяргей ВАРАНОВІЧ:** — У нас прапрацоўваецца пытанне аб тым, каб у кожнай вобласці і раёне былі створаны патрыятычныя цэнтры. Гэта паспрыяе не столькі абмену вопытам, колькі патрыятычнаму выхаванню моладзі. 52-і спецыялізаваны пошукавы батальён працуе з 1995 года. За гэты час вайскоўцамі выяўлены астанкі больш чым 39 тысяч загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, устаноўлены 3528 імёнаў загінулых. Было б добра, каб пра іх лёсы ведала падрастаючае пакаленне.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Неабходна падключаць рэзерв нашых ветэранаў. На месцах — вялізны пласт актывістаў, якія хочуць працаваць. Гэта ўжо хоць і пажылыя, але загартаваныя байцы. Вось чый патэнцыял трэба выкарыстоўваць. Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў, Беларускі саюз афіцэраў, Ваенна-навуковая супольнасць — тры маналіты, якія адказваюць сёння за патрыятычнае выхаванне. Мы можам вельмі шмат гаварыць аб патрыятызме, аб тым, што трэба ўмацоўваць патрыятычнае выхаванне, аднак, як бы тое ні гучала, для гэтага таксама патрэбны грошы.

**Ірына ДАЎГАЛА:** — У маёй Гомельскай-Савецкай выбарчай акрузе кожны год на Дзень Перамогі,

# 80 ГАДОЎ ТАМУ І СЁННЯ



Ірына ДАЎГАЛА.



Аляксандр КАВАЛЕНЯ.

Дзень Незалежнасці і ў Дзень абаронцаў Айчыны на Курган Славы моладзь горада, а таксама школьнікі прывозяць зямлю з месцаў баёў. На сённяшні дзень святая зямля сабрана больш чым з 530 месцін баявой славы. Аднак галоўнае тое, што дзеці самі наведваюць канкрэтнае гістарычнае месца, даведваюцца, што там адбылося, расказваюць аб героях тых мясцін. Гэта дарагога варта.

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ:** — У гэты адказны гістарычны момант вучоным неабходная не проста кансалідацыя, як нашым продкам у 1410 і ў 1941 гадах, а аб'яднацца з усімі здаровымі сіламі Беларусі, каб не толькі выстаяць, а перамагчы, дасягнуўшы новага этапу сацыяльна-эканамічнага і духоўна-культурнага развіцця беларускага народа. Для таго каб паспяхова будаваць багатую і шчаслівую Беларусь, улада і вучоныя, творчая інтэлігенцыя — усе, для каго будучыня краіны неабыякавая, абавязаны стварыць у краіне атмасферу нецярпімасці, якая б не дазваляла прарастаць прагнасці, крывадушнасці, жорсткасці, ілжывасці, невуцтву і ўсім іншым заганам чалавека. У грамадскім асяроддзі неабходна выбудоўваць сацыяльна-грамадскія ўмовы для дзейснага фарміравання грамадзянскіх і патрыятычных якасцяў падрастаючага пакалення.

***«ЗВЯЗДА»: — Але як гэта самае падрастаючае пакаленне зацікавіць?***

**Сяргей ВАРАНОВІЧ:** — Лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. У сваёй дзейнасці мы займаемся ўвекавечаннем памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў. Палявыя пошукавыя работы 52-м спецыялізаваным пошукавым батальёнам вядуцца штогод з красавіка да кастрычніка. Сёлета яны запланаваны на 147 аб'ектах у 48 раёнах Беларусі. Было б добра, калі б падчас пошукавых работ месцы раскопак перыядычна наведвалі школьнікі. Перш чым пачынаць работу на аб'екце, вайскоўцы вывучаюць гісторыю дадзенага месца, робяць прагноз, хто там можа быць пахаваны, у якой колькасці. У 2018 годзе, напрыклад, падчас адной з раскопак мы знайшлі астанкі чырвонаармейца. Па ацэнках экспертаў, яго прысыпала ў акопе ў першыя дні вайны. І ён як сядзеў, сагнуўшыся, такім мы яго і знайшлі: з каскай, са зброяй, біклага з вадой. Чаму б на раскопкі не прывесці дзяцей? Яны наглядна змогуць убачыць, якія чалавечыя ахвяры былі ў час вайны, што наша зямля дагэтуль захоўвае пасля баёў — падрастаючае пакаленне будзе мець канкрэтнае ўяўленне, якой цаной нам дасталася Перамога. А калі б дзеці яшчэ ўзялі ўдзел у пошукавых работах, то дакладна ўсвядомілі б, што вайна — гэта дрэнна. Гэта і ёсць ваенна-патрыятычнае выхаванне. Неабходна прыцягваць моладзь у пошукавую дзейнасць.

**Ірына ДАЎГАЛА:** — Тэма пошукавых атрадаў сёння надзвычай актуальная. І я дакладна ведаю, што, акрамя 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна Мінабароны, у абласцях ёсць тыя людзі, якія гатовыя займацца пошукавымі работамі, аднак для гэтага ў іх няма паўнамоцтваў. Чаму б не дазволіць тым жа былым вайскоўцам, ветэранам вайны ў Афганістане з дапамогай школьнікаў удзельнічаць у пошукавых работах на месцах? Гэта значна аблегчыла б задачу батальёну Мінабароны, які адзін на ўсю Беларусь, і часта, з аб'ектыўных прычын, не можа справіцца з тым вялікім аб'ёмам работы, які на яго ўскладзены. Вядома, трэба ўсё арганізаваць на такім узроўні, каб не было ніякага марадзёрства, але, як паказвае жыццё, патрыятычна настроеныя людзі душой хварэюць за агульную справу.

**Сяргей ВАРАНОВІЧ:** — У нашай краіне ўсё каардынавана. У Міністэрстве абароны ёсць пастанова № 16 аб супрацоўніцтве з грамадскімі аб'яднаннямі і грамадзянамі. З намі ўзаемадзейнічаюць грамадскія пошукавыя атрады. Напрыклад, ёсць канкрэтныя людзі, якія ведаюць, дзе знаходзіцца няўлічанае пахаванне. У мясцовых райвыканкамах або ваенкаматах яны складаюць інфармацыйны ліст. Калі ўпраўленнем па ўвекавечанні прымаецца рашэнне аб пошукавых работах на гэтым месцы, на раскопкі мы запрашаем і гэтых людзей. Аднак дакументальна ўрэгулявана, што без прадстаўнікоў 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна палявыя пошукавыя работы праводзіцца не могуць. І гэта, па-першае, звязана з марадзёрствам. Напрыклад, нядаўна на раскопках у Лагойскім раёне мы знайшлі 42 залатыя манеты. А калі б там працавалі іншыя людзі, дзе гарантыя, што гэтыя манеты не апынуліся б у іх кішэнях? Па-другое, на такіх аб'ектах часта выяўляюць выбухованебяспечныя прадметы. Па-трэцяе, мы вядзём дакладны ўлік астанкаў. І тут узнікае пытанне: ці змозжа непрафесіянал правільна іх падлічыць?

***«ЗВЯЗДА»: — А яшчэ, напэўна, вельмі важныя факты і дакументы, якія павінны быць у свабодным доступе з улікам інфармацыйных магчымасцяў.***

**Сяргей АЗАРОНАК:** — Не трэба ў гэтай справе скідваць з рахунку музеі — тыя сховішчы памяці, што не маюць тэрміну даўнасці. І чым старэйшыя экспанаты, тым яны больш каштоўныя. У дзяржаўным музеі гісторыі Узброеных Сіл цяпер дзейнічае выстаўка «Пакаленне міру аб вайне і міры». Сутнасць экспазіцыі ў тым, што пра вайну расказваюць дзеці: пра сваіх продкаў-ветэранаў, пра іх узнагароды, увогуле пра трагічныя старонкі нашай гісторыі. І калі падчас адной з паездак дзяўчынка дастала вельмі старую і падрапаную ляльку, а потым пачала расказваць, што гэта цацка яе прабабулі, якую жывой спалілі фашысты, нават у афіцэраў на вачах з'явіліся слёзы. І такі спосаб вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца найбольш эфектыўным. Чым не патрыятычнае выхаванне?

**Наталля ГОЛУБЕВА:** — Толькі дакументы, гістарычныя факты дадуць адказы на многія пытанні. Сумны вопыт нас навучыў, што нічога не трэба хаваць. Праўда, хоць і горкая, павінна быць праўдай. Таму неабходна раскрыць архівы і даць магчымасць навукоўцам працаваць з яшчэ нерассакрэчанымі дакументамі.

**Ірына ДАЎГАЛА:** — І пачынаць трэба са школы. Я пацікавілася і паглядзела падручнікі па гісторыі нашых школьнікаў. Удумайцеся толькі: перыяд Вялікай Айчыннай вайны яны вывучаюць толькі ў 9 класе ўсяго на пяці ўроках! Да гэтага часу ў падсвядомасці дзяцей ужо сфарміравана пэўная карціна тых падзей, якая можа супярэчыць праўдзе. І калі дома няма культуры памяці, калі дзецям не расказваюць аб продках-ветэранах, не выбудоўваюць генеалагічнае дрэва, не наведваюць памятныя мясціны, то аб якім патрыятычным выхаванні, правільным светаўспрыманні мінулых падзей можа ісці гаворка?! Высвятляючы гэтыя прабелы, у тым ліку ў выхаванні падрастаючага пакалення, мы сёння кампенсуем іх на заканадаўчым узроўні. Закон «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму», прыняты ў красавіку гэтага года, таму пацвярджэнне.

***«ЗВЯЗДА»: — Але ці здольны гэты закон вырашыць сітуацыю ў адносінах да гістарычнай праўды, паўплываць найперш на свядомасць людзей?***

**Наталля ГОЛУБЕВА:** — Нам сёння важна ўлічваць не толькі памылкі пачатку Вялікай Айчыннай вайны, а і памылкі пачатку 1990-х гадоў. Мы вельмі сціпла замоўчваем тое, што можа зрабіць меншасць. Згадаем парламент пачатку 1990-х. Невялікая група людзей у перыяд, калі адбываўся працэс шальмавання дасягненняў былога Саюза, камуністаў, у выглядзе БНФ зрабілі крокі, каб навязаць нам па сутнасці тую ж самую канцэпцыю нацыянальнага адраджэння, ідэю тытульнай нацыі, сімвалы, што і ў 1937 годзе. І толькі ўвядзенне паста прэзідэнта, рэферэндум, дзе большасць насельніцтва адштурхнула ўсё гэта, далі магчымасць ствараць самастойную незалежную дзяржаву.

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ:** — Нельга не заўважаць і таго, што палітычныя эліты ЗША і Еўрасаюза сёння разгарнулі актыўныя дзеянні па выцясненні Беларусі з гістарычнай прасторы цывілізацыйна-культурнага і палітычнага ўплыву славянскага свету. Робіцца шмат, каб дыскрэдытаваць і парушыць гістарычнае поле жыццядзейнасці нашых продкаў, а значыць, і наш сённяшні лёс. Прычым, дзеля вырашэння геапалітычнага супрацьстаяння, сёння ўсё больш шырока выкарыстоўваюцца інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, каб аказваць уплыў не толькі на фарміраванне дэструктыўнай грамадскай думкі праз сацыяльныя сеткі, але і прыняцце патрэбных палітычных рашэнняў. У сродках масавай інфармацыі насаджаецца ідэалогія спажывальніцтва, а паралельна ў камерцыйных сетках прыгожымі колерамі малюецца «шчаслівае жыццё за акіянам». Робіцца шмат, каб падтрымліваць у душах людзей запал прагнасці, ілжывасці, ганарлівасці, невуцтва, якія фарміруюць у душах падрастаючага пакалення разбэшчанасць, негатыўнае стаўленне да грамадзянскіх і патрыятычных пачуццяў, абыякавасць да нацыянальна-дзяржаўных і духоўна-культурных традыцый народа.

**Ірына ДАЎГАЛА:** — Сапраўды, падзеі апошніх гадоў у глабальным маштабе сведчаць аб частых у замежных дзяржавах выпадках наўмыснага скажэння гістарычнай праўды аб Другой сусветнай вайне, вырашальнай ролі савецкага народа ў перамозе над фашызмам, аб адраджэнні ідэй нацызму і фашызму ў іх гістарычным і сучасным праяўленні культывавання радыкальнага нацыяналізму, распаўсюджвання ідэалогіі нянавісці, якая з'яўляецца ўрадлівай глебай для росту неанацысцкіх настрояў. Яны здольныя перарасці ў фізічныя акцыі гвалту, ажно да развязвання войнаў лакальнага, рэгіянальнага і сусветнага ўзроўняў. Тое, што пачалі перапісваць гісторыю, нават з'явіліся грамадскія аб'яднанні аб абароне памяці і праўды аб вайне, стала сур'ёзным штуршком задумацца пра тое, што адбываецца. Узаемасувязь перапісвання гісторыі і накладвання пэўнага клішэ на сучасныя падзеі паслужылі асноўным рухавіком для падрыхтоўкі такога дакумента. І сёння менавіта закон «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму» ўтрымлівае амаль поўны паняційны апарат, які тлумачыць, што такое нацызм, што такое нацысцкая сімволіка і іншае. Прычым дакладна вызначана кола тых суб'ектаў дзяржаўнага кіравання, якія павінны не дапусціць гераізацыі нацызму, працаваць на прафілактыку і прымаць меры па выяўленні такіх фактаў. За парушэнне дадзенага закона прадугледжаны канкрэтныя меры адказнасці. Закон сёння дае дакладнае ўяўленне аб тым, што прадстаўляе сабой гераізацыя нацызму і што трэба рабіць, каб гэтага не дапусціць.

**Сяргей АЗАРОНАК:** — У нас павінны быць свае сімвалы. Аднак яны ў сваёй аснове павінны несці не разбурэнне, а стварэнне. Гэтыя сімвалы — асновы памяці аб вайне. Таму іх трэба берагчы. Калісьці амерыканцы прыдумалі такое паняцце, як мяккая сіла. Гэта культура, адукацыя, ідэалогія. Нам трэба ствараць такую мяккую сілу, якая будзе мацнейшай за любую жорсткую сілу.

**Наталля ГОЛУБЕВА:** — Талерантнасць, жаданне не варушыць старонкі мінулага, хоць не вельмі прыемныя, часам маюць зваротны эфект. Нам многае трэба пачынаць спачатку. І трэба памятаць аб сіле ідэалогіі, аб тым, што вайну, страшную, крывавую, выйгралі не столькі сілай зброі, колькі сілай савецкай ідэалогіі. І гэта вельмі важны ўрок для нас сучасных.

**Ірына ДАЎГАЛА:** — Вайна не скончана, пакуль не пахаваны апошні салдат. Значыць, работы ў нас вельмі шмат. Вельмі важна сёння быць разам з нашымі дзецьмі на месцах пахаванняў, разам з імі высвятляць, хто тут загінуў. І калі хоць бы адна сям'я ўстановіць хоць бы адно прозвішча невядомага салдата, гэта будзе каштоўней за ўсе ўзнагароды.

**Круглы стол правяла Веранiка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Крыніцы

## ЛЮСТЭРКА ПАМЯЦІ

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася экспазіцыя, прымеркаваная да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Выстаўка «Незабыўнае: спектаклі і фільмы аб вайне» падрыхтавана сумесна з Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай мастацтваў.**

Першая частка выставы, а гэта больш за 80 фатаграфій, якія распавядаюць аб тэатральнай і кінематаграфічнай дзейнасці ў гады вайны і пасляваенны перыяд, падрыхтавана расійскімі калегамі. Пры стварэнні экспазіцыі акцэнт рабіўся на найбольш знакавыя ў свой час спектаклі і фільмы. «Два байцы», «Чакай мяне», «Балада аб салдаце», «Знак бяды», «Вазьму твой боль», легендарны спектакаль «А досвіткі тут ціхія», які быў пастаўлены ў Тэатры на Таганцы.

На выставе можна пабачыць кадры як з шырокавядомых кінастужак, так і рарытэтныя фатаграфіі, зробленыя па спектаклях, у тым ліку і тыя, якія аматарам тэатральнага мастацтва раней былі невядомыя. А пачынаецца выстаўка з п'есы Аляксандра Карнейчука «Фронт», якая была пастаўлена ў 1942 годзе практычна на ўсіх тэатральных пляцоўках савецкай краіны, і гэта была першая пастаноўка, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне. На стэндах пададзены фатаграфіі, дзе акцёры розных тэатраў іграюць яе.

Падчас адкрыцця выставы загадчык Музея гісторыі кіно Ігар Аўдзееў заўважыў, што ў залежнасці ад таго, ці ўдавалася аўтарам адстаяць свае задумкі, атрымлівалiся розныя карціны. Так, за адну з найлепшых карцін беларуска-расійскай вытворчасці, народную трагедыю «Ідзі і глядзі» аўтарам давялося змагацца на працягу васьмі гадоў. Фільм неаднаразова запускалі і спынялі, але ўсё ж удалося дачакацца часу, калі задуму атрымалася рэалізаваць, прычым на 98 працэнтаў. Алесь Адамовіч, які ствараў сцэнарый, меў прафесійную адукацыю, як сцэнарыст ён выдатна разумеў, чым адрозніваецца літаратурная вобразнасць ад кінематаграфічнай, як перакласці мову літаратуры на мову кіно. Да гэтага часу ва ўсім свеце карціна «Ідзі і глядзі» прызнаецца адным з найлепшых твораў пра вайну, выйграе ў рэйтынгах, якія праводзяцца рознымі інтэрнэт-рэсурсамі. Карціна з'явілася дзякуючы грамадзянскаму подзвігу нашага класіка Алеся Адамовіча і вядомага савецкага рэжысёра Элема Клімава.

Ігар Аўдзееў згадаў яшчэ адну значную карціну, якая з'явілася ў выніку беларуска-расійскага супрацоўніцтва, — фільм Віктара Турава «Праз могілкі», які быў зняты ў 1964 годзе. Карціна зроблена па аповесці расійскага пісьменніка Паўла Ніліна, які апісваў сітуацыю ў Беларусі ў гады вайны. Адным з першых фільм закрануў далікатную і раней не ўзнятую тэму — што адбывалася ў душах людзей, якія аказаліся ў акупацыі. А яны перажылі шок, бо раней верылі, што вайна павінна была прайсці хутка, пераможна і выключна на варожай тэрыторыі. Аказалася, што за вельмі кароткі час Беларусь была занятая ворагам. Фільм расказвае, як людзі, пераадольваючы могілкі надзей у сваіх душах, адраджаюцца да актыўнага супраціўлення.

Тэма вайны і сёння прыцягвае цікавасць рэжысёраў і сцэнарыстаў. На жаль, не заўсёды яны ўлічваюць вопыт папярэднікаў і часам нават ствараюць «мыльныя» серыялы аб вайне, чым скажаюць успрыманне гісторыі, і гэта можа весці да іншых вынікаў, а не працягваць памяць пра вайну.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ОАО «Витязь», г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** Адрес: **Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Пионерская, 47-84а и 47-84** | |
| **Лот № 1** | |
| **Изолированное помещение № 1** (административное помещение, общ. пл. 8,9 кв. м, инвен. № 631/D-30029) | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 9 360,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 2** | |
| **Изолированное помещение № 2** (торговое помещение, общ. пл. 61,4, кв. м, инв. № 631/D-30030) | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 63 960,00 бел. руб.** | |
| ***Обременения***: площади помещений сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 26.07.2021 в 11.00. Окончание торгов: 26.07.2021 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.07.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Миноблавтотранс» (продавец)
проводит повторный открытый аукцион по продаже**

**Лот № 1: ЗДАНИЯ СКЛАДА** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание – Б1/к с асфальтобетонным покрытием-а)* **общей площадью 660,3 кв. м с инв. № 623/С-39575, адрес: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Первомайская, 37/6, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625650100003001690** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,6373 га по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Первомайская, 37**.

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **83 586,41** бел. руб. *Начальная цена снижена на 20 %.* (задаток 10 % от начальной цены – **8 358,64** бел. руб.).

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000В, площадь 0,0358 га; в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000В, площадь 0,0127 га.*

**Лот №2: ЗДАНИЯ СТАНЦИИ ЗАПРАВОЧНОЙ** *(составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание станции заправочной – А1/к с асфальтобетонным покрытием – а)* **общей площадью 47,6 кв. м с инв. № 623/С-39572, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625650100003001691** *(право постоянного пользования)* **площадью 0,3843 га по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. Первомайская, 37/7.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **37 544,64** бел. руб. *Начальная цена снижена на 20 %.* (задаток 10 % от начальной цены – **3 754,46** бел. руб.).

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000В, площадь 0,0175 га; в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000В, площадь 0,0488 га.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата по Лотам № 1 и № 2, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, производится в следующем порядке:

- 30 (тридцать) процентов стоимости имущества оплачивается в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи, оставшиеся 70 (семьдесят) процентов в течение 6 (шести) календарных месяцев с внесением платежей равными долями (по 11,6 %) с учетом ежемесячной индексации цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 18.03.2021. Аукцион состоится **14.07.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.07.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8(029) 583 95 98.**

УНП 600013199

---

ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки бумаги офисной формата А4 № 2021-909587, размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Целлюлозно-бумажное производство> Бумага для офиса».

УНП 100357923

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению антикризисного управляющего
ООО «Юрстайл групп»
(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404)
проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании Определения Экономического суда Минской области от 02.06.2021 по делу № 176-19Б/2020 открытый аукцион по продаже одним лотом имущества
ОАО «Молодечненское АТП»
(222310, Минская область, г. Молодечно, ул. Нагорная, 5, УНП 600077154) в составе:**

**- одноэтажный кирпичный гараж на 10 машин** *(составные части и принадлежности: склад, навес, площадка бетонная, тротуар, ограждение)*, **инв. № 630/С-49343, общей площадью 1221,1 кв. м,**

**- одноэтажное кирпичное здание склада, инв. № 630/С-49340, общей площадью 60,1 кв. м,**

**- одноэтажный склад запасных частей смешанной конструкции, инв. № 630/С-49342, общей площадью 86,8 кв. м,**

**- сеть водопроводная** *(составные части и принадлежности: трубопровод, трубопроводная арматура)*, **инв. № 630/С-79940, общей площадью 68,8 кв. м,**

**- сеть водопроводная** *(составные части и принадлежности: трубопровод)*, **инв. № 630/С-79992, протяженность – 111,6 м (далее – Объекты).**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623850100003001582 площадью 1,0107 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Нагорная, д. 5.

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,1491 га; охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0246 га.*

Начальная цена с без НДС – **259 450,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **25 945,00** бел. руб.).

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение, в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.**

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Аукцион состоится **23.07.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.07.2021** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,
телефоны для осмотра: (8029) 687 59 23, (8017) 396 61 34.**

УНП 600077154

---

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Зенит-БелОМО», ул. Чапаева, 26, 222416, г. Вилейка, Минская обл.** |
| **Предмет аукциона: административное помещение** общей площадью 64,9 кв. м, инвентарный номер 631/D-7446, расположенное по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. Гагарина, д. 12, корп. 1, пом. 1 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 86 170,56 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** 5 (пять) рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета аукциона:** в течение 10 **(десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Передача предмета аукциона производится в течение 5 (пяти) дней календарных дней после полной оплаты по товарной накладной и акту приема-передачи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов WWW.CPO.BY | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Аукцион состоится 26.07.2021 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.07.2021 до 17.00 по** указанному адресу | |

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № 2021.Ч.002.00021 по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «ВИТМИЛ», тел. +375 (212) 60 53 19.

**Организатор, оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 48-20-11, +375 (29) 884-96-79, +375 (29) 391-09-56, e-mail: **vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов**: 23.07.2021 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-58108, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Черняховского, д. 10, площадью 215,2 кв. м, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – кафе «Заря». Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000370, площадью 0,0393 га, предоставленном Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания кафе «Заря». **Нач. цена:** 434 000,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 43 400,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом ЭТП. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу **https://etpvit.by,** внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 22.07.2021. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: оплатить НДС в размере 20 % от цены продажи, возместить затраты на организацию и проведение торгов в соответствии со сметой затрат, оплатить услугу по размещению одного аукциона и затраты на обслуживание ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи в течение 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: **https://etpvit.by,** в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 60 53 19.

---

## Ликвидатор Частного предприятия «СКВОЗЬ ВРЕМЯ» (УНП 192840238, г. Минск) в связи с ликвидацией объявляет о проведении 23.07.21 в 12.00 торгов в форме аукциона по адресу: Минск, ул. Л. Беды, 29, помещение 1Н по продаже имущества Частного предприятия «СКВОЗЬ ВРЕМЯ»

лот № 1) Печатная машина MAXIFLEX 820-В COLORI. Начальная стоимость: 435 000 руб., **без НДС.**

лот № 2) Машина высокой печати Taiyo Label Printing Press TLS-250 -8C+1F. Начальная стоимость: 197 000 руб., **без НДС.**

Шаг торгов – 5 %. Задаток в размере 5 % от начальной цены лота перечисляется по следующим реквизитам: УНП 192840238, р/с BY86OLM30120000632700000933 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск, ул. Притыцкого, 60 корп. 2, БИК OLMPBY2X.

Договор купли-продажи предмета торгов может быть заключен с единственным участником торгов с увеличением стоимости соответствующего лота на 5 %.

Договор купли-продажи предмета торгов заключается в течение 3 дней со дня проведения торгов. Оплата по договору купли-продажи предмета торгов осуществляется в течение 5 дней с момента подписания договора. Предмет торгов по договору купли-продажи предмета торгов передается покупателю в течение 1 дня с момента полной оплаты.

Имущество находится в г. Минске. Вся информация и порядок осмотра согласовываются по телефонам, указанным ниже.

Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220040, Минск, ул. Л. Беды, 29, пом. 1Н или по электронной почте info@likvidator.by в срок до 17.00 22.07.21 г. Справки по тел.: +375 29 148-01-01 (вайбер, телеграм); +375 29 763-97-34 (вайбер, телеграм).

---

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 14.07.2021 повторного аукциона по продаже имущества ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

**Лот № 1:** **изолированное помещение с инв. № 700/D-85447 – нежилое изолированное помещение**, общ. пл. 1478,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85854 – Изолированное помещение образовательного, воспитательного и научного назначения**, общ. пл. 744,9 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3-2. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85857 – бомбоубежище**, общ. пл. 184,9 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85450 – нежилое изолированное помещение**, общ. пл 42,3 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000531 (площадь – 1,0722 га, право постоянного пользования, доля в праве 197/1000). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен. Обременение: аренда.

***Начальная цена продажи: 1 058 748,65 бел. руб. с учетом НДС.***

**Аукцион состоится 14 июля 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

# КАБ ВАДА — НЕ БЯДА, А ДАРОГА — НЕ ТРЫВОГА

## Калі губернатар завітаў да вас на падворак



Між тым пасля асабістых прыёмаў ёсць грамадзяне, якія пакідаюць кабінет з адказам: пытанне на кантролі старшыні аблвыканкама. За фармулёўкай — рэальная работа. Генадзь Салавей не раз выязджаў на падворкі да заяўшчыкаў, сустракаўся з імі на вуліцах населеных пунктаў, аглядаў зямельныя ўчасткі, якія станавіліся аб'ектамі спрэчак. За апошні час тройчы за такой работай па зваротах грамадзян удалося паназіраць журналістам.

Так, некалькі месяцаў таму на ўзровень кіраўніка рэгіёна выйшаў канфлікт паміж дзвюма жанчынамі — жыхаркамі пасёлка Забіяка Гомельскага раёна. Звярнулася Лідзія Дзедзікава, якая шэсць гадоў таму вырашыла прыватызаваць свой зямельны ўчастак. Тады і пачаўся канфлікт з суседкай, па сутнасці, з-за 30 сантыметраў зямлі, але гісторыя супрацьстаяння цягнецца не адзін год. Падчас асабістага прыёму губернатар паабяцаў разабрацца ва ўсім дэталёва і, як кажуць, пагля-дзець на аб'ект канфлікту на свае вочы. На месцы ён выслухаў абедзвюх жанчын.

— У любой спрэчцы ўлада не мае права абіраць чый-небудзь бок. Галоўнае — справядлівасць, усё павінна быць зроблена па законе, — падкрэслівае Генадзь Салавей.

Дарэчы, да візіту губернатара сюды неаднаразова прыязджалі прадстаўнікі розных ведамстваў, у тым ліку зямельнай службы. Ёсць афіцыйны дакумент 2017 года з подпісамі ўладальнікаў зямельных участкаў, і ён дакладна вызначае межы, — апелююць да фактаў, а не да эмоцый і крыўд прадстаўнікі ўлады. Безумоўна, вырашыць падобны канфлікт дапаможа толькі суд. Мясцовыя ўлады забяспечаць выкананне яго рашэння. Калі размова ідзе аб суседзях і барацьба ажыццяўляецца ўсяго за некалькі дзясяткаў сантыметраў зямлі — эмоцыі вылітыя, і застаецца надзея на мірны зыход канфлікту.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## На кантролі — культура землекарыстання

Пасля аднаго з нядаўніх зваротаў Генадзь Салавей вырашыў наведаць фермерскую гаспадарку ў Буда-Кашалёўскім раёне. Гэты візіт наспеў, калі на прыём да старшыні аблвыканкама прыйшоў кіраўнік сялянскай гаспадаркі Мікалай Гарохаў. На пачатку 2018-га ён атрымаў зямельны ўчастак на Буда-Кашалёўшчыне. Год працаваў над выкарчоўваннем старога саду, потым заняўся вырошчваннем кукурузы. Але ўжо летась здарылася фарс-мажорная сітуацыя: з-за хваробы і працяглага лячэння фермер не ўбраў культуру своечасова. Райвыканкам паведаміў аб рашэнні вярнуць участак сельгаспрадпрыемству. Старшыня аблвыканкама паабяцаў разабрацца з сітуацыяй на месцы. У вёску Бацунь, дзе знаходзіцца ўчастак Мікалая Гарохава, Генадзь Салавей прыехаў разам з кіраўніцтвам раёна. Фермер звярнуў увагу на вынікі сваёй работы, запэўніў, што імкнецца працягваць вырошчваць сельскагаспадарчыя культуры і нават не супраць яшчэ напалову павялічыць участак, тым больш што такая магчымасць ёсць. Вызначылі, наколькі фермер забяспечыў сваю гаспадарку тэхнікай, якія мае падыходы да належнага землекарыстання.

Падобная работа са зваротам непасрэдна на месцы дала магчымасць пагля-дзець на канкрэтны прыклад: наколькі эфектыўнай можа быць работа невялікіх фермерскіх гаспадарак на значных зямельных плошчах. Генадзь Салавей звярнуў увагу, што сёння сельскагаспадарчыя ўгоддзі ў Гомельскай вобласці складаюць звыш 1 мільёна 200 тысяч гектараў, і толькі каля 30 тысяч з іх апрацоўваюцца фермерамі. Для таго каб атрымліваць больш значныя ўраджаі, неабходна павышаць культуру землекарыстання на буйных прадпрыемствах. Што датычыцца звароту фермера Мікалая Гарохава, пасля дэталёвага вывучэння сітуацыі па рашэнні старшыні аблвыканкама зямельны ўчастак плошчай больш за 60 гектараў застанецца ў карыстанні сялянскай гаспадаркі.

## Каб вада не стала бядой...

Між тым цікавы яшчэ адзін нядаўні прыклад «некабінетнага» рэагавання на калектыўны зварот жыхароў аграгарадка Яроміна, што ў Гомельскім раёне. Яны наракаюць на якасць пітной вады і ўзнімаюць дарожнае пытанне. Генадзь Салавей вырашыў азнаёміцца з сітуацыяй на месцы і сустрэўся з мясцовымі жыхарамі.

Высновa па выніках агляду дарог: нельга сказаць, што ўсе яны дрэнныя, але частка вуліцы Вакзальнай, відавочна, праблемная. Асфальтавага пакрыцця тут не было ніколі. Пастаянныя падсыпкі дазвалялі зрабіць дарогу праезнай толькі на пэўны час. І ўсё ж высветлілася, што самыя актуальныя праблемы для жыхароў вуліцы — з вадой. Існуючая сетка састарэла, часта не вытрымлівае нават мінімальнага ціску. Людзям даводзяць, што хутка іх водаправод возьме на свой баланс Гомельводаканал, які плануе замяніць трубы і забяспечыць падачу вады па сучасных стандартах. Старшыня аблвыканкама прапаноўвае спачатку вырашыць праблему з вадой, пасля чаго знайсці магчымасць заасфальтаваць праблемны ўчастак праезнай часткі. Жыхары агра-гарадка з такім варыянтам пагадзіліся.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Малая радзіма

# У ПРЫВАЛКУ ДА... АЖЭШКІ

## У Гродзенскім раёне пачалося добраўпарадкаванне знакамітых крыніц

**Літаральна днямі каля іх з'явіліся стылізаваныя дубовыя шыльды. Усталяваны драўляныя лаўкі і парэнчы на крутым лесвічным спуску. Рыхтуюцца інфармацыйныя стэнды пра якасць вады. У найбліжэйшых планах — намер падаць праект на абласны конкурс ініцыятыў для далейшага фінансавання.**

Крынічны край знаходзіцца ў наваколлі вёскі Прывалка. Ад Гродна — крыху больш за 30 кіламетраў. Адметнасць раёна ў тым, што ён прыгранічны. Ад літоўскага горада Друскенікі ўсяго каля 10 кіламетраў. На думку старажылаў, крынічная вада мае такія ж якасці, што і ў вядомым курорце.

Мясцовыя жыхары здаўна ведаюць гэтыя крыніцы. Сюды вядуць сцежкі, зроблены лесвіцы, нават трубы для вады пракладзены. Па словах **старшыні Гожскага сельвыканкама Наталлі МАКАЎЧЫК,** крынічная вада запатрабавана не толькі ў мясцовага насельніцтва, але і гараджан. Карыстаюцца ёю і кіроўцы фур, якія стаяць на міжнародным пункце пропуску.

— На сёння грамадскасць ставіць пытанне аб добраўпарадкаванні крыніц, навядзенні парадку. Мясцовыя ўлады, вядома, гатовы падтрымаць ініцыятыву і аказаць пэўную дапамогу, — адзначыла старшыня сельвыканкама.

Праўда, яна ўдакладніла, што ёсць некаторыя абмежаванні. Напрыклад, бюджэтныя сродкі могуць укладвацца толькі ў тыя аб'екты, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельскага Савета. Гэта датычыцца, у тым ліку, і крыніц. У астатніх выпадках ёсць дамова з лясгасам, некаторыя віды работ дапамогуць выканаць спонсары. Не так даўно, падчас суботніка, на тэрыторыі крыніц валанцёры прыбралі смецце і пачысцілі лес.

Зараз добраўпарадкаванне пачалося з усталявання стыльных шыльдаў. Яны зроблены па ініцыятыве грамадскай арганізацыі «Крыніца». **Гродзенскі майстар разьбы па дрэве Мікалай СКЛЯР** апрацаваў дубовыя калодкі, на якія прымацаваны шыльды з выразанай назвай. З дапамогай работнікаў лясгаса ўказальнікі ўсталяваныя ў кірунку крыніц. У хуткім часе з'явяцца стэнды з інфармацыяй аб якасці вады па кожнай з іх.

— Добра, што ў нас з'явіліся шыльды. Яны выкана765ы з густам і ў стылі лясной інфраструктуры, майстар мае аўтарскае права на іх, — патлумачыла Наталля Макаўчык.

З падачы таго ж грамадскага аб'яднання крыніцы атрымалі ўласныя назвы. Напрыклад, у Прывалках крыніца носіць імя Элізы Ажэшкі. Згодна з мясцовымі паданнямі, гродзенская пісьменніца часта прыязджала ў мясцовы храм і спускалася да гэтай крыніцы набраць вады. На думку старшыні сельвыканкама, назву неабходна абгрунтаваць дакладнымі фактамі. Вялікі краязнаўчы матэрыял аб гэтых мясцінах сабраны ў мясцовай школе, ёсць багаты архіў у святара храма.

— Што датычыцца добраўпарадкавання самой крыніцы, пытанне мы абмяркоўвалі, і я думаю, што ў наступным годзе зможам нейкую частку бюджэтных сродкаў выдзеліць. Сёлета будзем ра-




мантаваць дарогі на гэтых участках і ў вёсцы Прывалка. Зробім масткі, парэнчы, пад'язныя шляхі, каб можна было пад'ехаць аўтобусам і аўтамабілем, але не зусім блізка, бо трэба не парушыць прыродны ландшафт, — дадала суразмоўца.

Каля крыніцы «Мар'яна» акрамя інфармацыйнага стэнда ўсталявана дубовая лаўка і аднаўлена лесвіца з парэнчамі. Водная артэрыя знаходзіцца далёка ў нізіне, таму да яе мясцовыя жыхары ўсталявалі спуск і нават «забралі» частку крыніцы ў пластыкавую трубу. Гродзенскі лясгас, на тэрыторыі якога знаходзіцца водны аб'ект, таксама актыўна ўключыўся ў работу. Падчас прыезду ініцыятыўнай групы аднаўляўся спуск да «Мар'яны».

— Гэта непасрэдна наш профіль работы. З цягам часу будзем мяняць трубы, якія крыніцу трымаюць, будзем іх аднаўляць, — паведаміў **ляснічы Гожскага лясгаса Назарый КОРШАК.** — Мы тут вядзём санітарнае прыбіранне кожны тыдзень. У нашым лясніцтве даволі шмат крыніц, можна сказаць, яны б'юць у кожным яры.

На думку прадстаўніка лясгаса, супрацоўніцтва з грамадскімі арганізацыямі садзейнічае падтрымцы экалагічнай раўнавагі, ахове навакольнага асяроддзя. Важна, каб людзі ведалі аб прыродным багацці і ставіліся да яго адказна. Сюды з кожным годам прыязджае ўсё больш людзей. Ды і тэма крыніц зараз на слыху, з'явілася жаданне пішь частку інфармацыі...

Як расказала кіраўнік ініцыятыўнай групы і **старшыня грамадскай арганізацыі «Крыніца» Тэрэза БЕЛАВУСАВА,** работа па добраўпарадкаванні вядзецца ў рамках творчага праекта «Гродзенская пушча». Ініцыятыва ўвайшла ў абласны конкурс грамадзянскіх і маладзёжных праектаў пад назвай «Стварэнне гаючага парку і экалагічнага турызму ў заказніку».

— Мы прадставім гэты праект на разгляд камісіі абласнога конкурсу ініцыятыў. У нас ужо ёсць напрацоўкі. Мы ўсталявалі шыльды. Потым будзе весціся добраўпарадкаванне тэрыторый, устаноўка лавак, столікаў, альтанак. Чарцяжы ўзгоднены з Гродзенскім лясгасам і аддзелам архітэктуры Гродзенскага райвыканкама, — расказала Тэрэза Белавусава. — Зараз ідзе першы этап, будуць другі і трэці. Мы распрацавалі буклеты, у тым ліку маршрут у памяць Элізы Ажэшкі, у гонар якой названа адна з крыніц.

Такая работа, лічыць грамадская актывістка, надасць значнасці гэтай тэрыторыі, раскрые яе патэнцыял. Разам з навуковым творчым калектывам «Прынямонне» пры НАН Беларусі «Крыніца» займаецца зборам дакументаў для надання вытокам статусу помнікаў прыроды. І такая верагоднасць ёсць. Увогуле, праект мае шанц трапіць у рэспубліканскую праграму «Зялёныя» тэхналогіі, рэсурсакарыстанне і экабяспека» на 2021—2025 гады. Як сцвярджае Тэрэза Белавусава, усе крыніцы маюць непаўторны склад вады. Такую асаблівасць заўважылі яшчэ продкі, а для таго каб праверыць гэта, будзе зроблены дакладны хімічны аналіз, які знойдзе адлюстраванне на інфармацыйных стэндах. Аматары праекта ўпэўнены, што аналагаў гэтай вады на тэрыторыі краіны больш няма.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Настаўнікі

# «СПАРТСМЕНЫ БЫЛІ ГАТОВЫЯ ЗРАБІЦЬ НЕМАГЧЫМАЕ І ЗРАБІЛІ»

**У спартыўных колах заслужаны трэнер Беларусі Генадзь ВІШНЯКОЎ вядомы як «Генсек», хоць адміністрацыйнай работай ён ніколі не займаўся, а прысвяціў сваё жыццё выхаванню плыўцоў. «Вельмі даўно мяне так назвалі мае вучні. Сваю ідэю яны растлумачылі тым, што я вырашаю ўсе пытанні і ўсё бяру на сябе, як сапраўдны генеральны сакратар. Я быў не супраць, і ўжо шмат гадоў спартсмены з пакалення ў пакаленне называюць мяне Генсекам», — усміхаецца Генадзь Аляксеевіч. Пакаленняў у «Генсека», які з 1972 года працуе трэнерам, сапраўды шмат. Цяпер ён выхоўвае плыўцоў-параалімпійцаў. На нядаўнім чэмпіянаце Еўропы разам са сваімі вучнямі яны выклікалі сенсацыю — заваявалі 19 медалёў. Цяпер уся ўвага — на Параалімпійскія гульні ў Токіа, пра што трэнер і расказаў «Звяздзе».**

***— Генадзь Аляксеевіч, 19 медалёў чэмпіянату Еўропы, безумоўна, добры вынік, вы яго планавалі ці гэта такі своеасаблівы сюрпрыз?***

— У нас цяжка праходзіла падрыхтоўка да чэмпіянату з улікам усіх абставін, у якія мы трапілі праз пандэмію. Мы не мелі магчымасцяў выехаць на зборы на адкрытую ваду, плыўцам для падтрымання формы трэба адзін-два разы на год трэніравацца на адкрытай вадзе. Не было спаборніцтваў, а дарослыя плыўцы павінны ўдзельнічаць у турнірах, каб удасканальваць сваю форму. І ўсе гэтыя цяжкасці паўплывалі на падрыхтоўку маіх вучняў, яны пачалі страчваць інтарэс да падрыхтоўкі. Яны прывыклі, што ўся выкананая на трэніроўках работа праходзіць праверку на спаборніцтвах, якіх не было, акрамя чэмпіянату Беларусі. Справіцца са складанасцямі нам дапамагалі Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальны параалімпійскі камітэт, РЦАП па параалімпійскіх і дэфлімпійскіх відах спорту.

**«Такіх людзей, як Аляксей Талай, у свеце амаль няма. І метадам спроб і памылак мы знайшлі методыку, якая за вельмі кароткі тэрмін дазволіла яму выканаць нарматыў на майстра спорту і дасягнуць высокіх вынікаў».**

З улікам усіх цяжкасцяў я не мог даваць гарантый па выступленнях на чэмпіянаце Еўропы. Былі сумненні, ці змогуць спартсмены сабрацца. Але мае вучні паказалі выдатнае выступленне, 90 % нашых плыўцоў праплылі па сваіх асабістых рэкордах. Мы прыехалі ў Партугалію за тры дні да пачатку турніру і спачатку спартсмены выглядалі не надта моцнымі. Але ў дзень старту адбыўся нейкі цуд, яны змяніліся, былі гатовыя да бою нават з самым моцным сапернікам. Я бачыў, што ў іх гараць вочы, гэта былі байцы. Яны былі гатовыя зрабіць немагчымае і зрабілі. Заваявалі 19 медалёў — гэта рэкорд за ўвесь час нашага ўдзелу ў чэмпіянаце Еўропы. У камандзе было 11 чалавек, 10 з іх — медалісты, што таксама рэкорд. На маім доўгім трэнерскім вяку ўпершыню паказаны такі вынік. Адзначу, што мы заваявалі вельмі важны бронзавы медаль у міксавай эстафеце, дзе выступалі дзве дзяўчыны і двое хлопцаў.

***— Хто з маладых спартсменаў асабліва вылучыўся і вас парадаваў?***

— Мы ўвогуле вялікую ўвагу ўдзяляем рэзерву, які будзе рыхтавацца ўжо да Параалімпійскіх гульняў 2024 года ў Парыжы. Мы разумеем, што ёсць сёння, што будзе заўтра, а што будзе пасля — невядома, таму важна, каб паміж пакаленнямі спартсменаў не было пустаты. З рэзервам у асноўным працуюць мае вучні — Стас Паздзееў і Дзмітрый Кошаль, гэта мае найлепшыя памочнікі. На чэмпіянаце Еўропы сваім выступленнем нас прыемна здзівіў Ягор Шчалканаў, у барацьбе з вельмі моцнымі сапернікамі ён змог заваяваць дзве «бронзы», змагаўся да канца. Гэта яго найлепшыя вынікі, якімі многія былі шакіраваны. За паўтара года ён паказаў сур'ёзны прагрэс. На ўсіх дыстанцыях у Партугаліі Ягор праплыў па асабістых рэкордах. Ён адзін з самых перспектыўных спартсменаў, наша будучыня. Спадзяюся, у Парыжы ён зможа змагацца за самыя высокія месцы. Пакуль рана казаць пра Токіа. Ёсць спартсмен, якому ўсяго 15 гадоў, — Уладзімір Сотнікаў, і ён ужо мае ліцэнзію на Параалімпійскія гульні ў Токіа. У нас расце моцная моладзь, і старэйшыя спартсмены Ігар Бокій, Дзмітрый Салей, Уладзімір Ізотаў ужо адчуваюць, што ім наступаюць на пяткі. Гэта матывуе іх, бо яны разумеюць, што нават невялікая слабасць прывядзе да зніжэння вынікаў, асабліва ў год, які мы так доўга чакалі, год Параалімпійскіх гульняў.

***— Галоўнай зоркай чэмпіянату Еўропы стаў Ігар Бокій, на яго ж і ўскладаюцца асноўныя надзеі на Параалімпійскія гульні ў Токіа?***



Генадзь ВІШНЯКОЎ з выхаванцамі.

— Ігар паказаў вельмі моцнае выступленне. Адчувалася яго максімальная мабілізацыя, сабранасць, на чэмпіянаце Еўропы ён правяраў сваю гатоўнасць да самых галоўных стартаў. У першы дзень, калі Ігар стартаваў, я ўбачыў, што гэты турнір будзе паспяховы. Я яго добра ведаю, працую з ім больш за 13 гадоў. І не падымаў пытанне, будзе рэкорд свету ці не, я верыў, што ён будзе, бо ўжо ў кваліфікацыі Ігар праплыў побач з рэкордам. Мы не падзяляем ранішнія кваліфікацыйныя заплывы і вячэрнія фінальныя. Я заўсёды вучыў Ігара не берагчы сябе на кваліфікацыі — паказваць добрыя вынікі. Гэта дае моцную мабілізацыю, а добра падрыхтаванаму спартсмену хопіць часу адпачыць і набрацца сіл перад фіналам. Таму ўжо раніцай Ігар паказваў добрыя вынікі і паляпшаў іх вечарам. Так адбылося на дыстанцыі 100 метраў дэльфінам. Ніхто не чакаў, што Ігар там установіць фенаменальны рэкорд. Адзіны, хто ў гэта верыў, быў трэнер. Нават калі Ігар адчуваў, што яго сапернікі слабейшыя, не расслабляўся. Ён на кожны старт выходзіў з мэтай паказаць максімальны вынік.

***— Ігару 27 гадоў, гэта добры ўзрост...***

— Ігар у спорце вышэйшых дасягненняў ужо даўно. Не кожнаму дадзена ўтрымацца на такім высокім узроўні, як у яго. Неабходна мець моцны характар, умець правільна трэніравацца. З гадамі ў спорце здароўя не прыбаўляецца. Ігар сталее, таму цяпер мы шукаем шляхі максімальнай рэалізацыі яго тэхнікі. У Ігара велізарныя магчымасці, і я веру, што ён можа плыць яшчэ хутчэй. Але стаіць іншае пытанне: раней было сем дыстанцый і сёння ўжо цяжка перамагаць на кожнай. Нам трэба рабіць стаўку не на колькасць, а на якасць. Ігар гатовы плыць усе сем дыстанцый, але на Параалімпійскіх гульнях скарочана яго любімая дыстанцыя — 100 метраў вольным стылем. Я так падазраю, не ўсім падабаецца, што Ігару ўдаецца заваёўваць столькі медалёў. Таму цяпер мы рыхтуем шэсць дыстанцый — пяць профільных і адну эксперыментальную — 100 метраў брасам. Цяжка сказаць, што атрымаецца, але мы плануем змагацца за медаль і тут.




Генадзь ВІШНЯКОЎ з Ігарам БОКІЕМ.

***— Генадзь Аляксеевіч, сярод вашых вучняў і Аляксей Талай. Як навучыць плаваць чалавека, у якога няма ні рук, ні ног?***

— Калі Аляксей да мяне звярнуўся з просьбай яго трэніраваць, я сумняваўся, наколькі гэта магчыма, але мы пачалі працаваць. На той момант ён быў вельмі слабы плывец, але я ўбачыў яго добрую плывучасць і стаў думаць, як яе выкарыстоўваць. У Аляксея маленькая канечнасць рукі і, дзякуючы ёй, мы пачалі вучыць яго правільна абапірацца на ваду і працаваць корпусам. У плаванні Аляксея галоўнае — гэта работа целам, як у рыбы тулавам, што вельмі няпроста. Мы актыўна ўмацоўвалі яго цела на сушы. Маленькія шанцы паплыць былі, і мы іх выкарысталі. Такіх людзей, як Аляксей Талай, у свеце амаль няма. І метадам спроб і памылак мы знайшлі методыку, якая за вельмі кароткі тэрмін дазволіла яму выканаць нарматыў на майстра спорту і дасягнуць высокіх вынікаў.

***— Устанавіць сусветныя рэкорды і заваяваць «бронзу» чэмпіянату Еўропы?***

— У тым ліку. Шанцаў на майскі рэкорд і на медаль чэмпіянату Еўропы было мала, але Аляксей максімальна іх выкарыстаў. Ён па натуры баец і заўсёды змагаецца да канца. Гэтая ўнутраная сабранасць, канцэнтрацыя і дазволілі яму заваяваць медаль. Мы ўсе радаваліся, што ён зрабіў немагчымае. У Аляксея алімпійскі від праграмы — плаванне на спіне. А яму больш падыходзіць плаванне на грудзях, з яго канечнасцю лепш плаваць брас, і ў гэтым ён ужо атрымаў поспех. Таму да Токіа мы рыхтуем спіну, разумеючы, што будзе цяжка. Шукаем шляхі для ўдасканалення яго падрыхтоўкі, каб зноў зрабіць немагчымае і змагацца за медаль. На Параалімпійскіх гульнях Аляксей будзе спаборнічаць з сапернікамі, якія выступаюць у лягчэйшым класе, адпаведна, іх функцыянальныя магчымасці большыя. Але нават з імі ён зможа змагацца.

***— А як навучыць плаваць татальна сляпых людзей?***

— У сляпых людзей моцна развітае адчуванне прасторы, само жыццё прымушае іх дакладна адчуваць свае рухі. Вядома, з імі трэба шмат працаваць, шмат работы праводзіцца на сушы, у спартыўнай зале. У такім выпадку трэнер не проста паказвае практыкаванні спартсмену, а бярэ яго рукі і накіроўвае іх, каб развівалася мышачная памяць, і гэта адпрацоўваецца да аўтаматызму. Сляпому чалавеку трэба даць адчуць кожны рух. Мы вучым спартсменаў лічыць грабкі ў вадзе. Напрыклад, 50 метраў ён павінен праплыць за пэўную колькасць грабкоў, і ўсе спартсмен плыве і лічыць. З часам тэхніка ўдасканальваецца, колькасць грабкоў змяншаецца. А на мінімальнай колькасці мы ўжо павышаем хуткасць. Многія з гэтых навыкаў патрэбныя сляпым людзям і ў звычайным жыцці. Гэта вялізная індывідуальная работа з кожным спартсменам, бо татальна сляпыя спартсмены — самы цяжкі клас. Але мне дапамагаюць мой вопыт і мае памочнікі.

***— Колькі ўсяго ліцэнзій на Параалімпійскія гульні ў Токіа маюць вашы вучні?***

— Цяпер мы маем дзесяць. Мужчыны атрымалі сем, імянная — у Аляксея Талая. Дзве ліцэнзіі маюць дзяўчаты, плануем атрымаць яшчэ адну на кваліфікацыйным турніры. У ліпені будзе Кубак Беларусі, і калі атрымаем высокія вынікі, папросім Міжнародны Параалімпійскі камітэт даць нам яшчэ адну ліцэнзію. Пакуль вырашаем, хто з дзяўчат паедзе ў Токіа. Дакладна — Настасся Зудзілава, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы. На другую ліцэнзію пакуль дзве прэтэндэнткі. Вопытная 48-гадовая Наталля Шавель (мы б усе хацелі, каб яна выступіла ў Токіа) і невядушчая Вікторыя Лукашэвіч, слабая ў індывідуальных выступленнях, але вельмі моцная ў міксавай эстафеце 4 на 100.

**«Сляпому чалавеку трэба даць адчуць кожны рух. Мы вучым спартсменаў лічыць грабкі ў вадзе. Напрыклад, 50 метраў ён павінен праплыць за пэўную колькасць грабкоў, і ўвесь спартсмен плыве і лічыць».**

***— Генадзь Аляксеевіч, спорт — гэта заўсёды пераадоленне магчымасцяў чалавечага арганізма. Вы, працуючы з людзьмі з праблемамі здароўя, даяце ім вялізныя нагрузкі. Бывае такое, што вам маральна цяжка гэта рабіць?***

— У пачатку работы з кожным спартсменам мы падрабязна расказваем, да чаго трэба быць гатовымі. Папярэджваем, што наперадзе цяжкі шлях і цікавімся, ці гатовыя людзі так жыць. Ёсць два віды параалімпійскага плавання: адаптыўнае — калі чалавек плавае для сябе, і спартыўнае. Тыя, хто плавае для дасягнення спартыўных вынікаў, разумеюць, на што ідуць. Дасягаючы пэўных вынікаў, яны павышаюць свой жыццёвы статус, набываюць імідж. Іх праца ацэньваецца, і яны пастаянна ўдасканальваюцца. А мы, трэнеры, у гэтым дапамагаем.

***— Лічыцца, што трэнер для спартсмена — другі бацька. А вы адносіцеся да сваіх спартсменаў, як да сваіх дзяцей?***

— Вядома, яны для мяне, як родныя дзеці, я іх вельмі люблю і паважаю. Я ўспрымаю сваіх спартсменаў такімі, якія яны ёсць, — з усімі іх слабымі і моцнымі бакамі. За многія гады работы ў мяне не было ніводнага выпадку, каб я камусьці нагрубіў ці кагосьці абразіў, гэта не ў маіх правілах. Я іх вучу не толькі спартыўным, але і жыццёвым правілам. І яны гэта цэняць, бо як мы ставімся да людзей, так і яны да нас. Як бы вучань ні памыляўся, я не даю выхад сваім эмоцыям, я не выношу на ўсеагульнае абмеркаванне праблемы канкрэтнага спартсмена. Калі ёсць заўвагі — скажу адзін на адзін. Многія разумеюць мяне не тое што з паўслова — з паўпогляда. Усе спартсмены розныя, яны мяняюцца з узростам, і трэба быць цярплівым. Самае галоўнае — умець разумець іх праблемы. Я атрымліваю задавальненне ад сваёй работы. Мне падабаецца кожны дзень сустракацца са сваімі вучнямі. Іх вынікі таксама рухаюць мяне наперад, даюць мне матывацыю ўдасканальвацца, вучыцца.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з асабістага архіва героя.**

У чаканні фестывалю

# КРОК ДА АЛІМПУ РОБІЦЬ УСЯ КРАІНА

## Што трэба ведаць пра галоўнае свята гэтага лета

**Сёлета Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь адзначае сваё 30-годдзе і запрашае на дзень нараджэння ўсіх ахвотных. Спартыўна-культурны фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» гэтым летам аб'яднае ўсю краіну, свята завітае ў кожную вобласць. Фестывалі ўжо прымалі Ліда, Орша і Кобрын, у чаканні — Мазыр, Бабруйск і Жодзіна.**




Гэта першы падобны праект у Беларусі, адметны не толькі маштабам, але і тэматыкай. Фестываль акумулюе вакол сябе спорт, культуру, мастацтва, адукацыю, турызм, развіццё рэгіёнаў — усё, чым жыве краіна, адкуль ідуць яе вытокі. За тры дні ўдзельнікі спартыўна-масавага мерапрыемства абмяркоўваюць гісторыка-культурную спадчыну рэгіёна і яго брэнды, захапляюцца сучасным мастацтвам, прадстаўляюць творчыя і інавацыйныя праекты. А кульмінацыя свята — спартыўны квэст, дзе кожны можа зрабіць свой крок да Алімпу.

Паколькі ўсё новае заўсёды нязведанае, расказваем, што трэба ведаць пра спартыўна-масавае мерапрыемства «Вытокі». А падзяліўся цікавымі фактамі **каардынатар праекта Аляксей КАРНЕЙ**.

— Вытокі праекта VYTOKI — у сямейным свяце Olympic Day. Добра вядомы праект Нацыянальнага алімпійскага камітэта Olympic Day. З 2016 года ён праводзіцца ў фармаце спартыўнага квэсту з рознымі пляцоўкамі. Дзеці могуць паспрабаваць розныя віды спорту, знайсці самы цікавы для сябе і атрымаць прыз. А бацькі могуць убачыць зацікаўленасць дзіцяці, пагаварыць з трэнерам, назапасіць важную інфармацыю і там жа запісаць сына ці дачку ў спартыўную школу. Улічваючы, што гэта мерапрыемства добра зарэкамендавала сябе ў Мінску, мы вырашылі прайсці з ім па рэгіёнах, аддаць ім даніну павагі, падарыць рэгіёнам такое свята.

### НЕ ТОЛЬКІ СПОРТ

Мы вырашылі напоўніць праект яшчэ і культурнай, адукацыйнай часткай, каб зацікавіць як мага больш людзей. У кожнага горада свае асаблівасці і варта раскрываць іх. Адзін з нашых партнёраў, кампанія «БелБрэндАўдыт», праводзіць цікавыя семінары па прасоўванні рэгіянальных брэндаў. Удзельнікі гэтых семінараў наведваюць з экскурсіямі мясцовыя прадпрыемствы — Кобрынскі масларобны-сыраробны завод, Аршанскі льнокамбінат. Цікавая частка праекта, добрая магчымасць для людзей з рэгіёнаў убачыць найлепшыя творы сучасных беларускіх мастакоў і вялікі падарунак для дзяцей, што развіваюцца ў гэтай сферы, — выстаўка «Кола часу» ад галерэі «АртХаос».

Станоўчыя водгукі выклікаў канцэрт арганнай музыкі, які праходзіць у першы дзень фестывалю. VYTOKI — гэта добры сімбіёз спорту і культуры. Таму людзям падабаецца і конкурс вакалістаў, які праходзіць на трэці дзень. Праз пандэмію падобных мерапрыемстваў стала значна менш. А для спевакоў выйсці на вялікую сцэну з добрым гукам — проста выдатна. Тым больш што гэта дадатковая частка свята для людзей, якія стаміліся і могуць пасядзець, паслухаць класную музыку, адпачыць, падтрымаць свайго земляка.

### ЗАПРАШАЕМ НА ЮБІЛЕЙ

Галоўная нагода правядзення фестывалю VYTOKI — юбілей Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Таму асноўная частка мерапрыемства — спартыўны квэст. Адначасова ў месцы яго правядзення знаходзіцца 4,5 — 5 тысяч чалавек. Мы стараемся рабіць 25–30 пляцовак, каб раздзяліць патокі і задаць пэўны спаборніцкі настрой паміж пляцоўкамі. Віды спорту ўсюды свае — у залежнасці ад таго, якія дысцыпліны пераважаюць у горадзе. Буйныя федэрацыі за кошт сваіх рэсурсаў вандруюць разам з намі па краіне. Напрыклад, федэрацыя лёгкай атлетыкі, федэрацыя футбола, хакейны клуб «Дынама-Мінск» на чале з федэрацыяй хакея. Чым больш пляцовак у горадзе — тым цікавей.



Галоўная мэта праекта VYTOKI — зрабіць крок да Алімпу, ад масавасці да спартыўнага майстэрства. Калі на мерапрыемства прыходзіць пяць тысяч дзяцей, сярод іх абавязкова адшукаецца спартыўны талент. Ён знойдзецца, запішацца ў секцыю, дзе будзе расці і развівацца. І ў гэтым наша ідэя — пашырыць аўдыторыю сем'яў, уцягнуць у спартыўны рух. Чым большая аўдыторыя — тым больш работы будзе ў трэнераў. І набор дзяцей у спартыўныя секцыі перарасце ў адбор, што вельмі важна для рэгіёнаў.

Мы прадстаўляем самыя розныя віды спорту: у тым ліку неалімпійскія, незвычайныя, працуюць пляцоўкі ДТСААФ, адукацыйныя пляцоўкі. У Лідзе была прадстаўлена робататэхніка, дзецям вельмі спадабалася. Усюды выдатна працуе пляцоўка пажарна-выратавальнага спорту, прадстаўлена яго тэхніка, якую дзеці з задавальненнем вывучаюць, фатаграфуюцца. У іх заўсёды незвычайныя конкурсы, нават экстрэмальныя з падвесам. Класна прасоўвае свой брэнд мінскае «Дынама». Асобную лакацыю робіць Белаагропрамбанк, наш спонсар, які праводзіць цікавыя інтэлектуальныя конкурсы. Федэрацыя валейбола выбрала незвычайны фармат, яны адначасова ўключаюць некалькі ўдзельнікаў, якія выконваюць спецыяльныя заданні з сумесі фітнесу і валейбола. За тры хвіліны адбываецца інтэнсіўная трэніроўка.

### ГАЛОЎНЫ ПРЫНЦЫП — ЦІКАВАЯ ГІСТОРЫЯ

У нас быў асноўны прынцып выбару гарадоў для правядзення фестывалю. Па-першае, гэта павінен быць не абласны, а раённы цэнтр. Па-другое, горад павінен мець цікавую культурную спадчыну. У Ліды багатая гісторыя з далёкіх часоў. Кобрын — горад рамеснікаў і гандляроў, таксама мае цікавы бэкграўнд. Орша цесна звязаная з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны. І пры выбары гарадоў мы звярталі ўвагу на іх спартыўнае жыццё. Выбіраючы пляцоўкі, звярталі ўвагу на тое, каб там былі розныя секцыі, каб мясцовыя жыхары маглі адразу ж запісаць дзіця. Зразумела, што мы прадстаўляем і віды спорту, якіх у гэтых рэгіёнах няма. Але дзякуючы нашаму фестывалю яны могуць з'явіцца. Напрыклад, у Кобрыне вялікі ажыятаж выклікала пляцоўка бокса, і гэта ўжо «званочак» — можа, варта ўдзяліць увагу гэтаму віду.



Мы аналізуем колькасць акрэдытацый, якія дзеці атрымліваюць для праходжання квэсту. Але дакладна адсачыць колькасць удзельнікаў вельмі цяжка. Таму што буклеты ўдзельнікаў, якія выдаюцца разам з акрэдытацыяй, часта бяруць і дарослыя, бо ім гэта цікава. Пакуль лідар — Орша, але гэта і горад немалы. Там толькі 5,5 тысячы дзяцей прайшло па акрэдытацыі. Чым была цікавая аршанская публіка — не ўсе ставілі сабе мэту выйграць прыз, многім было проста цікава прайсці гэты квэст. І каля 2300 падарункаў мы раздалі ў Оршы, у Кобрыне было менш — прыкладна 3,5-5 тысяч акрэдытацый, але і сам горад меншы, а публіка была вельмі актыўная.

У кожным горадзе ў фестывалі ўдзельнічаюць знакамітыя спартсмены. У Кобрыне, напрыклад, быў Аляксандр Глеб. Кожны раз мы да апошняга трымаем у тайне імя спартыўнай «зоркі». У Мазыры, улічваючы што гэта Мека веславання на байдарках і каноэ, плануем бачыць сям'ю нашых весляроў Марыны і Артура Літвінчукоў. Марына якраз цяпер актыўна рыхтуецца да Алімпійскіх гульняў у Токіа. У Бабруйску чакаем яго знакамітага ўраджэнца, алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Багдановіча. Вельмі шмат спартсменаў, якія жадаюць паўдзельнічаць і адкрыць мерапрыемства. Асаблівая падзяка сям'і біятлона — Людміла Ананька, Людміла Калінчык актыўна ўдзельнічаюць, праводзяць майстар-класы для дзяцей. Зразумела, што для тых максімальна цікава, калі кумір, якога бачылі толькі па тэлевізары, вучыць правільна трымаць вінтоўку... Усіх імёнаў пакуль не назаву, чым бліжэй да фіналу, тым больш ахвотных паўдзельнічаць...

### КОЖНЫ ГОРАД — АСАБЛІВЫ

Пакуль самыя найлепшыя водгукі ад удзельнікаў атрымала Орша. Вельмі зручная пляцоўка, вялікая тэрыторыя, і горад літаральна жыў святам. У кожным месцы мерапрыемства адрозніваецца і ўсюды яно добрае па-свойму. Ліда сканцэнтравалася на вялікай колькасці розных відаў спорту, яны нават правялі турнір па чырлідынгу. Адметнасць Кобрына ў тым, што ўсё праходзіла ў адным з самых старых і прыгожых паркаў краіны — парку імя Суворава.

Фінал таксама будзе яскравы. Мы плануем правесці яго 28 жніўня, у апошнія выхадныя лета, калі людзі рыхтуюцца не толькі да першага верасня, але і хочуць запісацца ў спартыўныя секцыі. Пляцоўку падбіраем ў адпаведнасці з філасофіяй брэнда VYTOKI, каб былі аб'яднаныя спорт і культура. Людзі з гарадоў, дзе ўжо быў фестываль, просяць прывезці яго ў наступным годзе. Таму «Вытокі. Крок да Алімпу» будзе мець працяг.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота НАК Беларусі.**

# ЗА ПАРУШЭННЕ — ДЭПАРТАЦЫЯ

## Прадстаўлены правілы паводзін для ўдзельнікаў Гульняў у Токіа

**Увесь свет жыве чаканнем галоўнай спартыўнай падзеі апошніх пяці гадоў — Алімпійскіх гульняў у Токіа. Чым менш часу застаецца да запальвання агню алімпіяды на Японскім нацыянальным стадыёне, тым большая ўвага да Гульняў. Расказваем апошнія навіны падрыхтоўкі да мультыспартыўнага форуму і ўсяго алімпійскага руху.**

**1.** Удзельнікаў Гульняў XXXII Алімпіяды ў Токіа могуць дэпартаваць за парушэнне антыковідных правілаў. Такія патрабаванні ўтрымліваюцца ў абноўленым Зводзе правілаў арганізатараў для атлетаў, апублікаваным на афіцыйным сайце Міжнароднага алімпійскага камітэта. Адзначаецца, што ў выпадку грубых парушэнняў абмежавальных мер, накіраваных на прадухіленне распаўсюджвання каранавіруса, прадугледжваюцца штрафы, адхіленне ад удзелу ў спаборніцтвах і прымусовая дэпартацыя. Да ліку парушэнняў адносяцца: адмова насіць маску, вытрымліваць сацыяльную дыстанцыю, наведваць месцы, загадзя не адобраныя для наведвання арганізатарамі, а таксама адмова праходзіць медыцынскі агляд.

**2.** Удзельнікаў Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў у Токіа абавязваюць выкарыстоўваць мабільны дадатак, у якім яны будуць паведамляць пра сваё самаадчуванне. Таксама ім прыйдзецца максімальна пазбягаць фізічнага кантакту з людзьмі, уключаючы поціск рукі, захоўваць дыстанцыю ў два метры паміж сабой і весці план сваіх дзеянняў.

**3.** Прадстаўлены п'едэстал для пераможцаў і прызёраў Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў у Токіа, музычная кампазіцыя ўрачыстых цырымоній узнагароджання і ўніформа валанцёраў. П'едэстал гонару выраблены з перапрацаванага пластыку і смецця. У эмблемах Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў выкарыстаны алюміній, які застаўся ад жылых дамоў, разбураных падчас землятрусу 2011 года. Арганізатары падкрэсліваюць, што, выкарыстоўваючы гэтыя матэрыялы, яны звяртаюць увагу на важнасць беражлівага стаўлення да навакольнага асяроддзя. Музычнае суправаджэнне цырымоній узнагароджання стварыў кампазітар Наокі Сата. Адзенне валанцёраў, якія будуць удзельнічаць ва ўрачыстых цырымоніях, сімвалізуе традыцыйнае для японцаў кімано.

**4.** Арганізацыйны камітэт летніх Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў у Токіа збіраецца скараціць да 41 тысячы чалавек агульную колькасць замежных дэлегацый. Яшчэ ў маі 2021 года прагназавалася, што максімальная колькасць членаў дэлегацый складзе 59 тысяч чалавек. А да пераносу Алімпійскіх гульняў арганізатары планавалі, што ў Японію прыедзе 141 тысяча чалавек у складзе дэлегацый.

**5.** Прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Спірас Капралас, мэрыя горада Марыбор і НАК Славеніі падпісалі пагадненне аб правядзенні XVII летняга Еўрапейскага юнацкага алімпійскага фестывалю ў 2023 годзе. Спаборніцтвы для найлепшых атлетаў Еўропы ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў пройдуць з 24 ліпеня да 1 жніўня 2023 года. Медалі будуць разыгрывацца ў 12 відах спорту. У Славеніі ўпершыню на ЕЮАФ будуць прадстаўлены маўнцінбайк, скейтбордынг, баскетбол 3х3 і футбол сярод дзяўчат.

Найбліжэйшы летні ЕЮАФ адбудзецца з 24 да 30 ліпеня 2022 года ў Банска-Бістрыцы (Славакія). Дадзены форум перанесены з 2021 года з-за загружанасці міжнароднага календара напярэдадні Гульняў у Токіа і сітуацыі з распаўсюджваннем каранавіруса ў свеце.

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома»

| Номер лота Местонахождение земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Срок аренды, наименование вида вещного права | Начальная цена, руб. | Расходы по формированию земельного участка, руб. | Сумма задатка, рублей | Целевое назначение Земельного участка | Ограничения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1 РИЗ «Аэропорт» к.п. Нарочь, У-45** | **0,1255** | **624083390501000030** | **частная собственность** | **13500** | **1679,54 + 299,52 за расходы на извещение в СМИ** | **1350** | **Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** (для размещения (размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) | **нет** |

| | |
|---|---|
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | ЛОТ № 1 электрические сети, центральное водоснабжение, центральное водоотведение |

| | |
|---|---|
| Порядок осмотра земельного участка на местности | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| Условия проведения аукциона | Наличие не менее двух участников |
| Продавец | Нарочский сельский исполнительный комитет |
| Организатор аукциона | Нарочский сельский исполнительный комитет |
| Документы, представляемые для участия в аукционе | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность для юридического лица копия свидетельства о государственной регистрации. Сумма задатка: 10 % от начальной цены на р/с BY61AKBB36006230819030000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код AKBBBY2X УНП 600537220. Получатель платежа: Главное управление МФ РБ по Минской области, код платежа 04002 |
| Конечный срок и адрес приема заявок | **19 июля 2021 г, до 17.00, аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49 (каб. 3). Контактные телефоны: (8-01797) 46153; 46710** |
| Дата, время и место проведения, аукциона | **23 июля 2021 г. в 11.00 аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49 (зал заседаний) Нарочский сельский исполнительный комитет** |
| Дополнительно | О возмещении затрат в соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в т. ч. проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» – возмещение не требуется |

### ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Малое Залужье, участок 2 (объект 25/2020), дер. Прилепская Усяжка (объект 159/2017), дер. Сосновая, участок 37 (объект 41/2017), дер. Дуброва, ул. Магистральная (объект 134/2017) Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

***Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | дер. Малое Залужье, участок 2 | 624883006601000153 | 0,1027 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 10000 |
| 2 | дер. Прилепская Усяжка | 624883008201000118 | 0,1207 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 12000 |
| 3 | дер. Сосновая, участок 37 | 624883010101000629 | 0,1312 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 30000 |
| 4 | дер. Дуброва, ул. Магистральная | 624883003801000327 | 0,09808 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 15000 |

**Аукцион состоится 27 июля 2021 г. в 15.00 в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел. 801776, 68030).**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

УНП 600046563

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества Торгового унитарного предприятия «Брестский рынок»

**Предмет торгов – Лот: предприятие как имущественный комплекс (Рынок «Варшавский»), с регистрационным номером 0001450, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Брест, в районе Варшавского шоссе и железной дороги Ковельского направления, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001031353, площадью 3,7722 га,** состоящий из:

1) капитальное строение с инв. № 100/С-67312 (наименование: здание администрации с камерой хранения; назначение: здание административно-хозяйственное), площадью 425,8 кв. м.

Составные части и принадлежности: туалет, трансформаторная подстанция, оборудование мини-котельной с газовой магистралью, водопроводная сеть, дождевая канализация, хозфекальная канализация (административная), линия наружного освещения, кабельная линия 10 кВ, стоянка;

2) капитальное строение с инв. № 100/С-52744 (наименование: торговый блок № 1; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 155,6 кв. м;

3) капитальное строение с инв. № 100/С-52740 (наименование: торговый блок № 1/1; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 77,5 кв. м;

4) капитальное строение с инв. № 100/С-60743 (наименование: торговый блок № 2; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 308,3 кв. м;

5) капитальное строение с инв. № 100/С-60744 (наименование: торговый блок № 3; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 308,9 кв. м;

6) капитальное строение с инв. № 100/С-60745 (наименование: торговый блок № 4; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 303,5 кв. м;

7) капитальное строение с инв. № 100/С-52746 (наименование: торговый блок № 5; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 166,6 кв. м;

8) капитальное строение с инв. № 100/С-52748 (наименование: торговый блок № 5/1; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 83,4 кв. м;

9) капитальное строение с инв. № 100/С-60746 (наименование: торговый блок № 6; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 333,8 кв. м;

10) капитальное строение с инв. № 100/С-60747 (наименование: торговый блок № 7; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 333,6 кв. м;

11) капитальное строение с инв. № 100/С-52736 (наименование: торговый блок № 9; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 179,4 кв. м;ф

12) капитальное строение с инв. № 100/С-52739 (наименование: торговый блок № 9/1; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 88,3 кв. м;

13) капитальное строение с инв. № 100/С-60750 (наименование: торговый блок № 10; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 334,7 кв. м,;

14) капитальное строение с инв. № 100/С-60751 (наименование: торговый блок № 11; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 332,9 кв. м;

15) капитальное строение с инв. № 100/С-91586 (наименование: торговый блок № 14; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 112,2 кв. м;

16) капитальное строение с инв. № 100/С-91582 (наименование: торговый блок № 15; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 118,9 кв. м;

17) капитальное строение с инв. № 100/С-60755 (наименование: торговый блок № 16; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 332,8 кв. м;

18) капитальное строение с инв. № 100/С-60756 (наименование: торговый блок № 17; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 214,2 кв. м;

19) капитальное строение с инв. № 100/С-60757 (наименование: торговый блок № 18; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 377,8 кв. м;

20) ограждение вокруг рынка с инв. № 669; 21) калитка с инв. № 022; 22) калитка с инв. № 023; 23) калитка с инв. № 024; 24) калитка с инв. № 026; 25) калитка с инв. № 027; 26) калитка с инв. № 028; 27) контейнерная площадка с инв. № 711; 28) пожарная сигнализация с инв. № 712; 29) вывеска «Варшавский рынок» с инв. № 020; 30) плиточное покрытие с инв. № 709; 31) огнетушитель в количестве 13 шт.; 32) стенд информационный 2,1-0,9 в количестве 1 шт.; 33) стенд информационный 2,4-0,9 в количестве 1 шт.; 34) стенд информационный охр. труда. пожарн в количестве 2 шт.; 35) баннер 7913 в количестве 3 шт.; 36) скамейки в количестве 4 шт.; 37) жалюзи вертикальные 1,3*1,85 R1,85 в количестве 1 шт.; 38) жалюзи вертикальные 1,3*1,30 R1,4 в количестве 1 шт.; 39) жалюзи вертикальные 1,9*2,05 R2,05 в количестве 1 шт.; 40) козырек в количестве 3 шт.; 41) контейнер для мусора в количестве 4 шт.; 42) щит информационный 125*135 в количестве 1 шт.; 43) урна металлическая 0,35*0,3*0,2 в количестве 19 шт.; 44) замок навесной в количестве 6 шт.; 45) щит буксирных приспособлений в количестве 1 шт.

| **Начальная цена продажи, руб. *(без учета НДС)*** | **2 600 000,00** | **Размер задатка, руб.** | **260 000,00** |
|---|---|---|---|

**Продавец:** торговое унитарное предприятие «Брестский рынок», 224016 г. Брест, ул. Карбышева, 25, тел./ф 80162 53-69-05.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
**Р/с для перечисления задатка:** BY32 BAPB 3012 7866 6001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест РД по Брестской области код банка BAPBBY2X УНП 201028245
**Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
**Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает вознаграждение Организатору аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней.
**Условия продажи:**
1. Сохранение деятельности рынка, с целевым назначением земельного участка – для обслуживания торговых блоков на срок не менее 1 (одного) года со дня заключения договора купли-продажи «Объекта»;
2. Сохранение среднесписочной численности работников в количестве 9 (девяти) человек на срок не менее 1 (одного) года со дня заключения договора купли-продажи «Объекта».
**Обременения:** договор аренды здания администрации с камерой хранения до 31.12.2022; договор аренды части торговых блоков до 31.03.2022; договор аренды стоянки до 31.03.2022

**Аукцион состоится 07 июля 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162)-40-87-01, 40-87-02, 8 (029) 626-72-52

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://ocenakabrest.by

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 06.07.2021 до 17.00**

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества КУП «Миноблавтосервис» (Продавец)

**Лот № 1: ЛЕГКОВОЙ ВНЕДОРОЖНИК УНИВЕРСАЛ (suv universal) TOYOTA LAND-CRUISER 120, кузов (рама) № JTEBU29J005143808. Цена – 28 866,34 руб.**

**Лот № 2: ЛЕГКОВОЙ ДЖИП HYUNDAI TUCSON, кузов (рама) KMHJN81DP6U527096. Цена – 9 949,45 руб.**

**Аукцион состоится 07.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by, Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «АП г. Барановичи»

**Лот № 1:** торговый киоск (ул. Советская 103), инв. № 1736, адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская у дома 103, автобусная остановка «Дом школьника». Начальная цена с НДС – 3 967,12 бел. руб. Задаток – 800,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Лот № 2:** торговый киоск (ост. «Технологический колледж»), инв. № 1792, адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Ленина, автобусная остановка «Технологический техникум». Начальная цена с НДС – 4 554,51 бел. руб. Задаток – 800,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Лот № 3:** торговый киоск (ул. Кабушкина), инв. № 1766, адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кабушкина, автобусная остановка «Автобусный парк». Начальная цена с НДС – 7 619,91 бел. руб. Задаток – 800,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 26.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 22.07.2021 в 11.00.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «АП г. Барановичи»

**Лот № 1, состав:** 1. Грузовой седельный тягач ДАФ FT XF 105.410, кузов (рама) № XLRTE47MS0E805161, г. в. – 2008; 2. Полуприцеп бортовой тентовый Кегель, кузов (рама) № WK0S0002400107953, г. в. – 2008. Начальная цена с НДС – 64 458,52 бел. руб. Задаток – 6 500,00 бел.руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Лот № 2, состав:** 1. грузовой седельный тягач ДАФ FT XF 105.410, кузов (рама) №XLRTE47MS0E812935, г. в. – 2008; 2. полуприцеп бортовой тентовый Кегель, кузов (рама) № WK0S0002400107954, г. в. – 2008. Начальная цена с НДС – 63 058,54 бел. руб. Задаток – 6 500,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 27.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 23.07.2021 в 11.00.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Што такое трапіць у бяду, з якой мужна змагаецца галоўны герой апавядання Валерыя Васілеўскага, аўтар ведае па сабе, па сваім болі і няспраўджаных юначых марах. І хоць лёс да яго героя, здаецца, больш літасцівы, уласным прыкладам Валерый Аляксандравіч даказвае, што галоўнае нават у самай цяжкай сітуацыі — не апускаць рукі, ставіць перад сабой вялікія мэты — і дасягаць іх. Валерый Васілеўскі шмат піша — і мастацкія творы, і нарысы, а таксама невялікія карэспандэнцыі, якія друкуе не толькі ў глускай раённых, але і ў абласных, рэспубліканскіх выданнях. Выдаў кнігу «Споведзь чалавека ў інваліднай калясцы». А яшчэ ён захапляецца жывапісам, аддаючы перавагу рабоце алеем. Пра ўсё гэта я даведаўся, ужо прачытаўшы апавяданне «Усё будзе добра!» А калі даведаўся, захацелася перачытаць яго яшчэ раз, каб наталіцца нязгасным аптымізмам і светлай дабрынёй аўтара.**

**Алесь БАДАК.**

**Валерый ВАСІЛЕЎСКІ**

# УСЁ БУДЗЕ ДОБРА!

НА досвітку прараб саўгаса Анатоль і шафёр бартавога «ўазіка» Яўген выехалі з роднага мястэчка ў абласны цэнтр па справах. Прамяні ранішняга сонца, прабіўшыся скрозь густую зяленіну лесу, які акружаў асфальтавую дарогу, падалі пад перадок іх машыны. Анатоль разглядаў справаздачныя дакументы, Яўген дыміў цыгарэтай, рабіў сваю шафёрскую справу. Мільгалі дрэвы і кусты, наперадзе быў вельмі стромкі паварот, празваны ў народзе «цешчыным языком». Хадзіла пагалоска, што жанчына праклала свайго нялюбага зяця-шафёра, з-за чаго той і разбіўся насмерць на гэтым павароце. З таго часу хто-небудзь з шафёрні ці матацыклістаў не-не ды зляціць у кювет, здараліся і лабавыя сутыкненні.

На павароце Анатоля прыціснула бокам да дзверцаў і, на імгненне адарваўшыся ад папер, ён убачыў наперадзе грузавік, які нёсся прама на іх, ішоў лоб у лоб. Потым быў моцны ўдар спераду — і Анатоль кудысьці паляцеў... Праз лабавое шкло. На асфальт, размаляваны сонечнымі блікамі.

Супрацоўнікаў ДАІ і машыну хуткай дапамогі выклікаў выпадковы матацыкліст. Яўгену меддапамога ўжо не спатрэбілася, а Анатоля, у якога была крывавая калатуша галавы, тэрмінова даставілі ў нейрахірургічнае аддзяленне абласной бальніцы, дзе з рознымі траўмамі апынуўся і шафёр грузавіка.

Праз некаторы час з аперацыйнай выйшаў доктар. Ён паведаміў сястры Анатоля Святлане, што яе брат атрымаў цяжкую траўму галавы і знаходзіцца ў коме, ёсць падазрэнне на пашкоджанне пазваночніка.

Седзячы каля бальнічнага ложка брата, Святлана, склаўшы рукі на каленях, горка плакала. Слёзы, брудныя ад тушы, каціліся па шчоках. Страціўшы маці маленькай дзяўчынкай, яна ўжо ведала, што значыць страціць блізкага чалавека. І зараз лёс ізноў павярнуўся самым непрывабным бокам. Сэнс яе жыцця засяродзіўся на адзіным блізкім чалавеку, які цяпер ляжыць перад ёй без руху, на мяжы паміж жыццём і смерцю. Брат быў для яе і маці, і бацькам, якога ніколі не ведала.

Святлана ўсе дні і ночы праводзіла каля пасцелі Анатоля. Дзяўчына трымала яго за кволую руку і маліла Бога, каб яе брат акрыяў. Прасіла Анатоля, каб ён не здаваўся, змагаўся за жыццё і выйшаў з каматознага стану.

Чэпкія абдымкі смерці, у якіх некалькі месяцаў знаходзіўся Анатоль, нарэшце аслаблі. Ён нават не падазраваў, колькі разоў пераплываў змрочную раку ў лодцы старога Херона. Пра гэта ведалі толькі ўрачы, якія прыкладалі тытанічныя намаганні, каб спыніць набліжэнне смерці. І зараз, пасля амаль двух месяцаў, праведзеных у стане комы, напаўжывы Анатоль раптам прыпадняў запаленыя павекі. Першае, што ён убачыў, былі крылы бялявага анёла, якія па меры вяртання «адтуль» усё больш станавіліся падобнымі на рагі звычайнага медыцынскага халата. Нарэшце ён разгледзеў як у тумане далікатную, ладную фігурку медсястры, што ўвайшла ў палату.

Анатоль раптам усвядоміў, што жывы, і ўзрадаваўся. Ён перамог у барацьбе з гэтай страшнай пачварай, якая стаяла з касой над яго душой. Паспрабаваўшы расплюшчыць вочы шырэй, ён ледзь не аслеп ад яркага дзённага святла, якое праходзіла праз шкло вялікіх вокнаў на белыя сцены і столь. Яго ложак быў абсталёваны нейкімі прыборамі. Медсястра змяніла кропельніцу, штосьці адзначыла ў лістку, які ляжаў побач на століку. Потым выйшла з палаты, ціха прычыніўшы за сабой дзверы, і Анатоль пачуў знаёмы голас:

— Як ён? Ужо ачуняў? Да яго можна?



— Так, праходзьце, — адказала медсястра.

У дзвярах з'явілася Святлана ў накінутым на плечы белым халаце. Наблізіўшыся да ложка, яна паклала сваю цёплую далонь на брату нерухомую руку:

— Добры дзень!

— Добры дзень, сястрычка! — слабым голасам адказаў Анатоль.

Сабраўшы ўсе сілы, ён паспрабаваў зрабіць рух насустрач і прыпадняцца з ложка, але не змог. Яго цела было нейкім чужым і цяжкім.

— Ціха, ціха! Вам нельга варушыцца, — кінулася да Анатоля медсястра, якая толькі што ўвайшла ў палату.

Анатоль з жахам паглядзеў туды, дзе пад коўдрай павінны быць ногі. Мяркуючы па форме складак коўдры, яны былі на месцы. Але ён іх не адчуваў. Як быццам ад доўгага ляжання, яны здранцвелі. Высілкам волі паспрабаваў паварушыць вялікім пальцам нагі. Ніякага выніку. Праз сілу паспрабаваў яшчэ раз. Нага не рухалася. Анатоль зразумеў, што больш хадзіць не будзе. Слёзы роспачы і крыўды пацяклі па яго нягалеых шчоках. Ад злосці ён скамечыў пальцамі коўдру. Прыступ плачу затрос яго цела, і слёзы пакаціліся на падушку. Ён адвярнуўся, хаваючы ад Святланы твар. Медсястра звярнулася да дзяўчыны:

— Яму шкодна хвалявацца. Вам лепш пайсці.

— Так-так. Ужо іду... — адказала тая і выйшла.

Агаліўшы Анатолеву руку да локця, медсястра ўмелым рухам увяла ў вену дозу заспакаяльнага са снатворным. У сне ён бачыў зялёную паляну з мяккай травой і рэчку. Спрытна падскокваючы, ён адбіў рукамі валейбольны мяч, які лёгка ўзняўся ў блакітнае бяздоннае неба... Спатыкнуўшыся, Анатоль упаў на траву. Хацеў адразу ўскочыць, але не мог... Як быццам нешта трымала за ногі. Ён кінуў на іх позірк і ўбачыў замест ног дзве драўляныя падпоркі. Дзіка закрычаўшы, Анатоль прачнуўся ў халодным поце і азірнуўся па баках. Гадзіннік на століку ўпэўнена адлічваў час яго непатрэбнага жыцця.

Вось ужо некалькі дзён урачоў не на жарт непакоіў стан Анатоля. Яго моцнаму маладому арганізму ўдалося справіцца з цяжкай траўмай галавы. Але пашкоджанне ніжняга аддзела пазваночніка парушыла нервовыя канчаткі, пазбавіла яго здольнасці рухацца, зрабіўшы паралізаваным да пояса, і зараз усе турбаваліся не за фізічны стан Анатоля, а за псіхіку. Хоць той і сам выдатна разумеў, што яго становішча практычна безнадзейнае.

АНАТОЛЬ ляжаў, гадзінамі ўтаропіўшыся ў столь. Цалкам страціўшы цікавасць да жыцця, ён упаў у глыбокую дэпрэсію. Стан яго з кожным днём пагаршаўся. Наведвальнікі толькі ўзмацнялі становішча напамінам пра тое, што калісьці ён быў звычайным чалавекам, а не 22-гадовым інвалідам, прыкаваным да бальнічнага ложка.

Сеансы дасведчанага псіхолага не далі ніякіх вынікаў. Наадварот, пасля сеансаў Анатоль цалкам замкнуўся ў сабе, маўчаў, мучыўся адчуваннем уласнай непаўнавартасці. Святлана прыходзіла ў палату кожны дзень і сядзела каля ложка. Але Анатоль нібы не заўважаў яе. Ён думаў: «І чаго яна сядзіць каля мяне, нямоглага выродка, асуджанага ў лепшым выпадку на інвалідную каляску? На што яна спадзяецца, можа, на цуд? Дык гэта бывае толькі ў казках». Ад такіх думак яго твар станавіўся яшчэ больш змрочным. Жаданне памерці ўзрастала з кожным днём.

«Ну, чаму я тады не загінуў, як Яўген, адразу? Лепш пагібель, чым такое жаласнае існаванне», — думаў ён. І смерць ізноў пачынала над ім кружыцца, абвяваючы магільным холадам сцены бальнічнай палаты.

Урач-хірург прыйшоўся па кабінеце, ссунуўшы бровы, задумаўся. Потым падышоў да стэнда, уключыў святло і яшчэ раз уважліва паглядзеў рэнтген-здымкі. На чорным фоне плёнкі былі выразна бачны рэбры, пазваночнік і косці таза. Паціраючы падбародак, ён адкрыў гісторыю хваробы. Прабегшы вачамі некалькі лісткоў, адклаў убок справу і накіраваўся ў палату пацыента.

— Добры дзень!

Анатоль паглядзеў на яго абыякава і адвёў вочы.

— Я хачу з табой пагаварыць вось пра што. Сёння я займаўся вывучэннем гісторыі тваёй хваробы і прыйшоў да высновы, што можна табе вярнуць здольнасць хадзіць.

Анатоль рэзка павярнуўся, яго вочы ўспыхнулі нездаровым бляскам.

— Гэта, натуральна, адбудзецца не адразу. Давядзецца зрабіць некалькі сур'ёзных нейрахірургічных аперацый на пазваночніку. І далёка не факт, што ты потым адразу ўстанеш і пойдзеш. Доўгія працэдуры дапамогуць вярнуць адчувальнасць ног.

— Я згодзен, доктар!

— Але ты павінен ведаць пра рызыку, звязаную з гэтымі аперацыямі. Іншымі словамі, гэта значыць, што гарантаваць поспех мы не можам.

Анатоль схапіўся за словы ўрача як за саломінку. Атрымаўшы маленечкую надзею на звычайнае існаванне, ён адчуў у сабе сілы змагацца.

Ужо на наступную раніцу каля яго ложка стаяў вядомы ў навуковых колах прафесар сталічнага інстытута нейрахірургіі. Агледзеўшы Анатоля, ён зрабіў заключэнне пра агульны стан здароўя. Малады арганізм і дужае сэрца былі ў стане вытрымаць шэраг найскладанейшых шматгадзінных аперацый, падчас якіх, магчыма, атрымаецца аднавіць парушаныя нервовыя канчаткі. Параіўшыся з хірургам бальніцы, ён пайшоў у рэнтген-кабінет і доўга вывучаў здымкі, пасля чаго вярнуўся ў палату. Урачы прынялі станоўчае рашэнне.

— Святлана, — звярнуўся хірург да дзяўчыны, якая ўвайшла ў яго кабінет, — вам неабходна ведаць: сёння адбылася гутарка з вядомым нейрахірургам. Мы прыйшлі да высновы, што ёсць надзея вярнуць Анатолю магчымасць хадзіць самастойна. Шанцы невялікія, але паспрабаваць варта. У адваротным выпадку ён не вытрымае маральнага злому, які нанесены яго абезрухомленым станам.

— Так, доктар. Я лічу, што можна паспрабаваць. Толькі ў нас няма грошай на аплату, мабыць, вельмі дарагой аперацыі.

— Але вы павінны таксама ведаць пра рызыку, непазбежна звязаную з гэтай найскладанейшай аперацыяй. Ваш брат можа не вытрымаць. А наконт грошай вы не думайце.

— Безнадзейнасць цяпер падобна забойству. Таму рабіце тое, што лічыце патрэбным.

З гэтымі словамі Святлана пакінула кабінет доктара і накіравалася да палаты Анатоля. Калі яна ўвайшла, маладая бялявая медсястра папраўляла падушку пад галавой Анатоля, які адчайна хацеў сесці і падцягваў рукамі ніжнюю, нерухомую частку свайго цела.

— Вы можаце ісці, — адпусціла Святлана медсястру і стала папраўляць падушку. Паклаўшы на плячо Анатолю руку, яна з усмешкай сказала:

— У мяне для цябе ёсць добрыя навіны. Я гаварыла з урачом. Ён лічыць, што можна паставіць цябе на ногі.

— Дзякуй, сястрычка! Ты мая выратавальніца!

Яго вочы гарэлі надзеяй. Пасля гэтулькіх дзён роспачы ён раптам адчуў сябе амаль здаровым. Хацелася бегаць па палаце, падняць Святлану на рукі, закруціць яе ў шалёным рытме. Але ён не мог. Пакуль не мог. І гэта «пакуль» яго цешыла.

Прайшло некалькі гадзін чакання, перш чым з аперацыйнай выйшаў хірург. Павярнуўшыся да прыгожай дзяўчыны, якая сядзела ў крэсле і нервова церабіла насоўку, сказаў:

— Аперацыя прайшла паспяхова!

Дзяўчына ўскочыла і, удзячна паглядзеўшы ў стомленыя вочы доктара, прашаптала:

— Дзякуй, доктар!

— Гэта наша праца, — адказаў той і пайшоў далей па калідоры.

Святлана глядзела на людзей у белых халатах, якія кацілі каталку з Анатолем, і думала: «Усё будзе добра! Не турбуйся, брацік!»

ПРАЙШЛО некалькі месяцаў. Анатоль перанёс не адну аперацыю і ўжо мог уставаць. Ён яшчэ кепска перасоўваў ногі, але доктар сказаў, што ён будзе хадзіць. Надзея з часам вярнуцца ў звычайнае жыццё рабіла цуды.

Святлана ўвайшла ў палату з букетам простых палявых кветак. Доктар, падтрымліваючы Анатоля пад локаць, дапамог яму дайсці да новенькай інваліднай каляскі, якую яшчэ з раніцы медсястра ўкаціла ў дзверы палаты. Атрымаўшы магчымасць перасоўвацца па калідоры аддзялення, Анатоль цешыўся як дзіця. Пакінуўшы ненавісны ложак, дзе правёў не адзін месяц, ён упершыню мог зірнуць у акно. За празрыстым шклом быў свет.

У працы і поце прайшло яшчэ каля трох гадоў, дзе кожная гадзіна, кожны дзень адкрывалі Анатолю новыя адчуванні. Ён больш упэўнена стаяў на нагах. І першае, што па магчымасці зрабіў, — паехаў у царкву і паставіў свечку ў памяць пра Яўгена, які быў яго аднагодкам, па волі року прыняў на сябе ўдар і сышоў з жыцця такой недарэчнай смерцю. Анатоль вельмі перажываў праз гэта. Але жыццё працягвалася. Значыць, — трэба жыць!

Яму, калі ўжо абыходзіўся без інваліднай каляскі, а першая група інваліднасці была заменена на трэцюю працоўную, як былому воінуафганцу дзяржава бясплатна выдзеліла аўтамабіль «жыгулі» з ручным кіраваннем. Вярнуўся на ранейшае месца працы і стаў рыхтавацца да стварэння сям'і. Увесь гэты час Анатоль пражываў у бацькоўскай хаце з сястрой, пад яе строгім патранажам. Святлана выйшла замуж, але брата не забывае: тэлефануе, дапамагае, як можа і чым можа. Вінаватага трагедыі асудзілі. Не стала і паварота «цешчын язык», які больш-менш выраўнялі.

І мы там былі

# «КРОШЫНСКІ ПЕРАЗВОН» У ГОНАР БАГРЫМА

**АГРАГАРАДОК Крошын, што ў Баранавіцкім раёне, — месца, дзе спалучаюцца дзве на першы погляд супрацьлеглыя з'явы: узнёслая паэзія і зямное рамяство. А ўвасобіў усё гэта адзін чалавек — Паўлюк Багрым. Вядомы аўтар аднаго верша «Зайграй, зайграй, хлопча малы» праславіўся яшчэ і як таленавіты каваль: сёння ў крошынскім касцёле Божага цела захоўваецца жырандоля, выкаваная рукамі майстра.**



## БРЭНД ВОБЛАСЦІ

У мінулыя выхадныя ў Баранавіцкім раёне ўшанавалі памяць знакамітага земляка. У аграгардку Крошын, адкуль родам паэт і каваль, 19—20 чэрвеня прайшло свята кавальскага майстэрства «Крошынскі переразвон». Яно — даніна павагі земляку і ўжо своеасаблівы брэнд Баранавіцкага раёна.

«Некалькі гадоў таму паўстала пытанне пра тое, што Баранавіцкі раён мае багатую гісторыю, а ў нас няма свайго брэндавага мерапрыемства. Чаму менавіта Крошын? Таму што тут нарадзіўся Паўлюк Багрым, тут знаходзіцца яго знакамітая жырандоля, ён тут і пахаваны. І чаму б не адштурхнуцца ад гэтай тэмы?» — расказвае гісторыю свята **Аксана ШЧЭРБА, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Баранавіцкага райвыканкама.**



Першае падобнае свята праводзілася ў Крошыне 15 гадоў таму па ініцыятыве баранавіцкага гісторыка і краязнаўцы Аляксандра Жука. Але тады працягу мерапрыемства не атрымала. У 2016 годзе Крошын зноў стаў цэнтрам кавальства. А з гэтага года свята набыло абласны характар. «Гэта брэндавае мерапрыемства не толькі для Баранавіцкага раёна, але і для ўсёй Брэсцкай вобласці. Такі фестываль у нас адзін. І ўдзельнікі, і гледачы прыехалі з усёй краіны, што падкрэслівае яго цікавасць і важнасць», — адзначыў **начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Сяргей ПАНАСЮК.** Сёлета мерапрыемства прайшло пры фінансавай і іншай падтрымцы аблвыканкама.

Аналагаў такому святу ў Беларусі пакуль няма. Гэта адзінае сапраўднае спаборніцтва кавалёў. Галоўная частка «Крошынскага пераразвону» — конкурс «Каваль куе, жаўрук пяе». «Вядома, сапраўдныя кавалі сёння вельмі запатрабаваныя, у іх шмат заказаў. Гэта старажытнае рамяство, і ахвотных навучыцца яму шмат. Выраб, выкананы сваімі рукамі, — непаўторны. Таму мы праводзім конкурс, каб даць магчымасць майстрам паказаць сябе, а гасцям свята — пазнаёміцца з гэтым старажытным рамяством», — адзначыла Аксана Шчэрба.

Сваё майстэрства ў Крошыне дэманстравалі сямёра кавалёў. Дзмітрый Шашкоў і Георгій Підэнка — з Баранавіцкага раёна, Максім Манчак і Аляксандр Матусевіч — з Баранавіч. Сяргей Блеззэ прыехаў са Стоўбцаў, яшчэ адзін прадстаўнік Мінскай вобласці — Максім Давідовіч. А Алесь Вараб'ёў — гродзенскі каваль.

«Кавальская справа — адно са старадаўніх і самых паважаных рамёстваў, у народзе каваля лічылі волатам, у чыіх руках жалеза і агонь становяцца паслухмянымі. Прадметы, вырабленыя кавалямі, не маюць паўтораў, кожная рэч унікальная і адзіная ў сваім выкананні. Дзякуючы вытокам нацыянальных традыцый беларусы застаюцца самабытным народам. І сёння нам як ніколі неабходна памятаць пра сваю самабытнасць. Гэтае свята вяртае нас да вытокаў гісторыі», — сказаў, адкрываючы свята, **старшыня Баранавіцкага раённага выканаўчага камітэта Сяргей КАРПЕНКА.** Дарэчы, гэты «Крошынскі перазвон» — яго першае свята на пасадзе старшыні райвынканкама.

## НАЙЛЕПШЫЯ СЯРОД РОЎНЫХ

Пачалося свята з падарункаў Крошыну. На пляцоўцы каля мясцовага Дома культуры быў адкрыты арт-аб'ект — музычная лаўка, а ў самой установе з'явіўся каваны стол. Новыя славутасці пасёлка, якія адразу сталі фотазонамі, зрабілі пераможцы конкурсу на найлепшы арт-аб'ект Дзмітрый Шашкоў і Георгій Підэнка. Дарэчы, арт-аб'екты ўжо сталі традыцыйнай спадчынай «Крошынскага перазвону». Пасля мерапрыемстваў 2016 і 2019 гадоў у пасёлку засталіся дэкаратыўная арка-падкова і ліхтар. А скульптура «Жаўрук Багрыма» ў круглай зале мясцовага Дома культуры стала важнай часткай вясельнага абраду, які тут праводзіцца. Пасля рэгістрацыі шлюбу жаніх і нявеста абавязкова гладзяць жаўрука. Месцічы вераць, што гэта прынясе сямейнае шчасце. Конкурсныя работы кавалёў таксама застануцца ў Крошыне. Госці пасёлка змогуць наведаць і вернісаж кавальскага майстэрства.

Хоць усе майстры і прывезлі ў Крошын свае вырабы, каб паказаць іх гасцям свята, гэтага не хапіла... Як было недастаткова прадставіць і хатняе заданне — выкаваць насценны ліхтар. Пакуль усе адпачывалі, кавалям прыйшлося папрацаваць: на працягу трох гадзін яны выкоўвалі кандэлябр. Лепшы метад пазнаёміць гасцей свята з кавальскім рамяством прыдумаць цяжка. Гледачы ў рэжыме рэальнага часу назіралі за працэсам стварэння шэдэўраў. У выніку ў намінацыі «Выстава-продаж каваных вырабаў» перамаглі Дзмітрый Шашкоў і Георгій Підэнка. Лепей за ўсіх з хатнім заданнем справіўся Максім Манчак. Ён жа стаў найлепшым кавалём па выніках галасавання гледачоў. Першае месца суддзі аддалі кандэлябру, які выканаў Алесь Вараб'ёў.

Узначальваў журы беларускі мастацтвазнаўца, этнолаг, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, член Міжнароднай федэрацыі народнай творчасці Яўген Сахута. Ён высока ацаніў арганізацыю свята і ў прыватнасці конкурсу кавальства. «Прыемна, што кіраўніцтва Баранавіцкага раёна цэніць і шануе памяць Паўлюка Багрыма, і ў яго гонар праводзіцца такое свята. Майстры-ўдзельнікі ўсе таленавітыя, многія з іх вядомы за межамі Беларусі. Хацелася, каб «Крошынскі перазвон» у перспектыве выйшаў на рэспубліканскі ўзровень», — адзначыў ён.

## ПАРАД УМЕЛЬЦАЎ

Сваё майстэрства гасцям «Крошынскага перазвону» дэманстравалі не толькі кавалі. У межах свята прайшоў фестываль «Напевы зямлі маёй», які стаў сапраўдньй прэзентацыяй адметнасцяў кожнага раёна. Самымі актыўнымі былі, вядома, прадстаўнікі Брэсцкай вобласці. Свае таленты паказвалі творчыя калектывы з горада Кобрына, Пінскага, Лунінецкага, Ляхавіцкага, Драгічынскага раёнаў. Майстры народнай творчасці Бярозаўскага, Маларыцкага, Ляхавіцкага раёнаў праводзілі майстар-класы і арганізавалі цэлы міні-музей вырабаў народнай творчасці. Прэстыжнасць і важнасць рэгіянальнага свята ўзнялі майстры з Лідскага раёна і горада Гомеля. Агульныя намаганні арганізатараў і ўдзельнікаў свята зрабілі яго праграму насычанай і разнастайнай. Кожны змог знайсці сабе занятак па душы. Для аматараў народнай творчасці — прэзентацыі рамёстваў, выступленні народных музыкаў, фальклорная праграма. Літаратары маглі завітаць на «Бібліятэчны падворак», які ўтульна размясціўся ў цені старога парку. Нават у мінулае можна было трапіць, дзякуючы паказальным выступленням клуба гістарычнай рэканструкцыі. Цікава было на свяце не толькі дарослым — забаўлялі тут і малых.

У другі дзень «Крошынскага перазвону» з канцэртам выступіў беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры».

## У ГОСЦІ ДА БАГРЫМА

У час, калі ўнутраны турызм Беларусі набыў другое дыханне «Крошынскі перазвон» — не проста мерапрыемства, а яшчэ і складнік турыстычнага брэнду Баранавіцкага раёна. А паглядзець у Крошыне сапраўды ёсць што. Адметнае нават месца правядзення свята — парк шляхцічаў Святаполк-Завацкіх, пасаджаны ў XIX стагоддзі. Парк вядомы велічнымі ясенямі і дубам, які ў 1884 годзе пасадзілі вядомы вучоны Ігнат Дамейка і паэт Антон Адынец. У цэнтры парку сёння знаходзіцца Дом культуры, у «круглай зале» якога можна пазнаёміцца з моднай калекцыяй беларускіх народных касцюмаў. Недалёка ад парку — мемарыяльны знак на месцы, дзе размяшчалася кузня Паўлюка Багрыма і дзе ў 1881 годзе нарадзілася яго знакамітая жырандоля. Сам цуд чалавечага таленту сёння знаходзіцца ў мясцовым касцёле Божага цела. Першы касцёл у Крошыне быў пабудаваны ў 1442 годзе, а ў 1920-я гады ўзведзены сучасны мураваны будынак. Паўлюк Багрым назаўсёды застаўся на радзіме. Непасрэдна за сценамі касцёла — яго магіла, побач з помнікам знаходзіцца памятны валун з надпісамі па-лацінску і па-беларуску: «Vita brevis — Patria eterna», што азначае «Жыццё кароткае — Радзіма вечная».

Крошын ужо ўключаны ў мноства турыстычных маршрутаў па Баранавіцкім раёне, сама гісторыя пасёлка схіляе да гэтага. Арганізатары ўпэўнены, што «Крошынскі перазвон» павысіць цікавасць турыстаў да мястэчка. Бо брэнд сёння — вялікая сіла.

«Крошынскі перазвон» не толькі брэндавае свята Баранавіцкага раёна, але і доказ таму, што нават нікуды не выязджаючы можна выдатна правесці выхадныя. Спалучэнне гісторыі, крэатыву, таленту і душэўнасці нікога не пакінуць раўнадушнымі.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*Баранавіцкі раён.*

Радзіннае

# «ЭтнаБУМ» на Гродзеншчыне

**Творчы этна-праект па бытавых танцах цэнтралізавана стартаваў 19 чэрвеня ў сем гадзін вечара ва ўсіх мястэчках вобласці, дзе ёсць клубныя ўстановы. «ЭтнаБУМ» працягнецца ўсё лета. Патанцаваць па-даўнейшаму можна будзе раз на тыдзень у адзін і той жа дзень і час, а сачыць за графікам майстар-класаў — на сайце і тэлеграм-канале ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама — арганізатара танцавальнага свята.**

Праект, падобнага якому ў Беларусі яшчэ не было, скіраваны на адраджэнне і захаванне мясцовых традыцый танцавальнай культуры, фарміраванне ў маладога пакалення нацыянальнай самасвядомасці праз далучэнне дзяцей і моладзі да аўтэнтычнага фальклору, расказалі ў Гроднааблвыканкаме. Арганізатары спадзяюцца, што праз праект вернуць да жыцця самабытныя танцы, многія з якіх амаль забыліся.



Каб зладзіць майстар-класы па беларускіх бытавых танцах для ўсіх ахвотных, супрацоўнікі клубаў найперш самі асвойвалі танцавальную навуку і развучвалі традыцыйныя для рэгіёна танцы: «Кракавяк», «Нарэчанька», «Падэспань», «Вішанька», «Млын», «Ойра», «На базар», «Полька».

Цяпер штотыдзень надвячоркам каля Дамоў культуры або ў парках ці зонах адпачынку блізу вадаёмаў яны будуць перадаваць гэтую навуку ўсім жадаючым, каб разам дакрануцца да самабытных вытокаў.

Танцы, вядома, будуць паўтарацца, аднак пры гэтым адзін і той жа танец у пэўных мястэчках будзе мець свае рэгіянальныя асаблівасці. Напрыклад, класічны «Кракавяк» танцуецца ў парах, а ў Дзятлаўскім раёне яго выконваюць у «тройках». Бытавыя танцы — унікальная магчымасць стаць актыўным удзельнікам свята, бо не патрабуюць харэаграфічных уменняў. Яны першапачаткова задумваліся для таго, каб іх маглі выконваць людзі любых узростаў і танцавальных навыкаў, сцвярджаюць арганізатары.

Калі нашы продкі танцавалі, іх рухі адлюстроўвалі думкі, эмоцыі, настрой. Пасля цяжкай працы менавіта ў танцах яны аднаўлялі сілы, каб назаўтра пачаць новы рабочы дзень.

**Ірына СІДАРОК.**

**Міхась КАЗЛОЎСКІ:**

# «ПЕРАД ТЫМ ЯК ПІСАЦЬ, УГЛЯДАЮСЯ Ў ФОТАЗДЫМАК, АСАБЛІВА Ў ВОЧЫ МАЙГО ГЕРОЯ»

## Краязнавец — пра аўтографы Чорнага і Караткевіча, пра вяртанне забытых імёнаў

**Аднойчы, пішучы пра маладзечанскага бібліяфіла і краязнаўца Міхася Казлоўскага, я згадала «прынцып Несцеркі»: як вядома, беларускі казачны герой на пытанне, дзе цэнтр зямлі, тыцнуў кульбачкай перад сабой і сказаў: «Тут. Не верыце? Перамерайце». Міхась Казлоўскі, нястомны руплівец, падобна Несцерку, стварае цэнтр беларускага культурнага жыцця там, дзе жыве. У Маладзечне дзякуючы яму выдаецца краязнаўчы альманах «Куфэрак Віленшчыны», выходзяць кнігі, адбываюцца канферэнцыі... Нядаўна бібліяграфія самога Міхася папоўнілася двухтомнікам «Пад сузор'ем веры і надзеі».**

***— Што новага ўвайшло ў твой двухтомнік?***

— Нават тое, што было ў ранейшых кнігах, дапоўнена новымі звесткамі. Ну, і працэнтаў шэсцьдзясят зусім новага тэксту. Напрыклад, у раздзеле «Нечаканыя знаходкі» з цыкла «Бібліяфільскія гісторыі» распавядаецца пра каталог мастацкай суполкі «13» і аўтографы Уладзіміра Караткевіча... Не друкаваліся раней артыкулы «Паштовыя пісулькі беларускай гімназіі», «Паштоўкі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа»... Дадаўся артыкул пра мініяцюрныя і некаторыя малафарматныя кнігі, пра тое, як у Вільні я знайшоў архіў Адама Станкевіча... Усё не пералічыш.

***— Цікава, што новага прагучала пра аўтографы Караткевіча?***

— Гэта пра экспанаты з маёй хатняй бібліятэкі. Некалькі разоў мне ўдавалася набыць кнігі з подпісамі Караткевіча, адрасаванымі розным асобам, у мінскіх букіністычных крамах. Аднойчы знайшоў у кнігарні першы паэтычны зборнік «Матчына душа», які выйшаў у 1958 годзе. Цяжка паверыць, але ён вельмі дрэнна разыходзіўся, і вялікую частку накладу пусцілі пад нож. Разгортваю... На франтыспісе — малюнак: зубр рыхтуецца да бойкі, на тытульнай старонцы — аўтограф, невядома да каго скіраваны, і без подпісу. «Кнізе сто год. Няхай і нам будзе з часам двойчы па сто. Трымаемся, браце. 23.12.64 Менск». Купіў за сціплую суму... Аўтограф жа невядома чый, невядома каму. Але я почырк Караткевіча ніколі не зблытаю.

Кожны аўтограф патрабуе расшыфроўкі. Я пачаў шукаць і знайшоў. Алег Лойка ў сваім рамане «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» напісаў, што мае гэты аўтограф, працытаваў яго дакладна. Думаю, яны з Караткевічам сядзелі за сталом, за сяброўскай бяседай, таму і атрымалася без подпісу і адрасата. Яшчэ выпадак... Паэт Віктар Шніп атрымаў у якасці падарунка ад жонкі кампазітара Глебава некалькі рукапісаў вершаў Караткевіча. Адзін з іх падарыў мне — я доўга не мог паверыць, што мая мара стала рэальнасцю. Гэта верш «Раманс шлагбаума».

***— Так што ты працуеш і як дэтэктыў?***

— Безумоўна. Напрыклад, у раздзеле «Пуцявінамі страчаных скарбаў» распавядаецца пра мае пошукі рукапісаў некалькіх вершаў Максіма Багдановіча. Я пастараўся, як кажуць, метадам дэдукцыі вылічыць, дзе яны могуць знаходзіцца. Матэрыял заканчваю аптымістычна, словамі з апавядання яшчэ аднаго вядомага бібліяфіла Барыса Сачанкі «Іван Патапавіч Белахвосцік — кніжны Шэрлак Холмс»: «Шукайце, не сядзіце ў хаце, а хадзіце па людзях, пытайце, што ў каго ёсць з рукапісаў і старых кніг. Пад ляжачы камень вада не цячэ... І я веру: знойдуцца тыя скарбы. Не могуць не знайсціся». Прарочыя словы.

***— Ты робіш, як раіў Барыс Сачанка...***

— Справа ў тым, што старых хат, пра якія ён казаў, амаль не засталася. Паўсюль стараюся знайсці нашчадкаў беларускіх дзеячаў. Часта гэта людзі далёкія ад беларускай справы, у іх мала што захоўваецца... Але ў некаторых, улічваючы, што яны інтэлігенты не ў першым пакаленні, маецца тое, што датычыцца памяці пра іх продкаў.

***— Напэўна, даводзілася беларускія рэдкія выданні знаходзіць на сметніцах, на гарышчах...***

— Безумоўна, бывала і такое. Да таго ж ты не ведаеш, дзе можна знайсці самае цікавае, яно бывае ў самым непрадказальным месцы. Аднойчы тэлефануе мне з Мінска адзін знаёмы: «Тут кніжка ў мяне ёсць, можа, вам патрэбная». Пытаюся, што за кніжка. «Ды нейкая «Молодая Белоруссия». Я сказаў, прыеду, пагляджу. А сам прыкідваю... «Маладая Беларусь» — быў часопіс, які выходзіў у 1912—1913 гадах у Санкт-Пецярбургу, тры нумары выйшла. Меўся яшчэ ў Заходняй Беларусі часопіс пад такой назвай, у 1936-м. Выйшаў толькі адзін нумар. А яшчэ пад такой назвай магла быць кніжка Льва Клейнбарта 1928 года, даволі рэдкая. Прыязджаю — на стале ляжыць тоўстая кніжка, кінуў вокам на вокладку — «Клейнбарт». А на развароце — аўтограф: брат Клейнбарта падпісвае невядомай кабеце, «на памяць аб маім браце».



***— У тваіх зборах, безумоўна, шмат кніг з аўтографамі... Якія самыя дарагія?***

— З самых дарагіх аўтографаў, адрасаваных мне, — аўтограф Караткевіча. «Паважанаму Міхасю Казлоўскаму, каб заўсёды заставаўся такім, якім выявіў сябе з самага пачатку, і каб хутчэй вяртаўся пад белыя крылы. 24 сакавіка 1979 года». Так напісаў Уладзімір Сымонавіч на кнізе «Зямля пад белымі крыламі». Чаму тут пра вяртанне пад белыя крылы? Я ў войску тады служыў. Аўтограф гэты я атрымаў дзякуючы гісторыку, краязнаўцу і літаратуразнаўцу Генадзю Каханоўскаму, з якім мяне пазнаёміла мая настаўніца. Я з ім ліставаўся, калі служыў у арміі. Каханоўскі быў у добрых адносінах з Караткевічам і ў нейкі момант паказаў таму мае лісты. Лісты сапраўды незвычайныя, як я сёння разумею. Цікавы быў той васямнаццаці–дзевятнаццацігадовы хлопчык... Дзіва, пра што марыў, якія прозвішчы згадваў... І гэта тады, у 1978—1979 гадах.

***— І пра што ж той хлопчык разважаў?***

— Ну, напрыклад, пра творчасць Язэпа Лёсіка. Я ж не разумеў, што трэба неяк «канспіратыўна» ставіцца, што гэты пісьменнік адносіцца да катэгорыі забароненых... Мяне здзівіла: яго імя згадваюць, на яго спасылаюцца, а творы нідзе не знайсці. Дык я і пытаўся ў Генадзя Каханоўскага, дзе прачытаць кніжкі Лёсіка. Альбо Вацлава Ластоўскага, альбо Алеся Гаруна... Нават сёння не ўсе ведаюць гэтыя прозвішчы.



***— А той хлопчык адкуль ведаў?***

— А той хлопчык, як гаварыў Караткевіч пра падобных, быў дапытлівы суб'ект. Памятаю, у падручніку па беларускай літаратуры для восьмага класа літаратура пачатку XX стагоддзя дзялілася на дзве плыні — рэакцыйную і прагрэсіўную. Да прагрэсіўнай Купала і Колас адносіліся, а да рэакцыйнай — Вацлаў Ластоўскі, Гарун, Каганец, якія ідэалізавалі феадальнае мінулае, прапагандавалі класавы мір... Я начытаўся такіх выказванняў, і мне надта хацелася даведацца, што ж гэтыя людзі такое дрэннае пісалі? Я пачаў шукаць... Чытаў у энцыклапедыях іх біяграфіі. Выпадкова знайшоў у сваёй настаўніцы хрэстаматыю новай беларускай літаратуры Ігната Дварчаніна 1927 года выдання, яна выходзіла ў двух варыянтах: у выглядзе тоўстага фаліянта з раздзеламі і паасобных сшыткаў. Вось адзін з такіх сшыткаў і пачынаўся вершам «Начныя думкі»: «Межы, курган векавечны і хвоя, ка́ня з аднэю малітваю «піць»... А на вокладцы напісана: «А. Гарун». Ліст з біяграфіяй і фотаздымкам паэта быў вырваны. Але, прачытаўшы яго вершы, я зразумеў: ён жа добры паэт! Дык чаму пра яго гавораць, што ён такі дрэнны? Відаць, Генадзь Аляксандравіч, здзівіўшыся ведам гэтага неафіта, паказаў лісты Уладзіміру Сымонавічу... А той расчулена падпісаў гэтую кніжку.

***— Якія самыя цікавыя экспанаты калекцыі?***

— Знайшоў выпадкова ў Вільні невялікую кніжачку ў цвёрдай палатнянай вокладцы. «Хвоі гавораць» Кузьмы Чорнага 1926 года ў афармленні Ахола-Вало. З аўтографам: «Марыі Шутавічанцы ад шчырасці. Кузьма Чорны. 6 кастрычніка 1944 года. Менск». І пячатка з пазнакай «Кнігазбор кс. Адама Станкевіча». Даследаваць гісторыю аўтографа дапамог дзённік Кузьмы Чорнага, у якім ёсць запіс пра тое, што да яго зайшла Марыя Шутовіч з Вільні, пакаёўка ксяндза Адама Станкевіча. «Яна прыехала ў Менск, каб дайсці тут якое-небудзь рады: віленскі біскуп Ялбжыкоўскі садзіць усюды на Беларусі на канфесіі палякаў ксяндзоў, якія і прапаведуюць з амбоняў, што ўсе беларусы каталікі ёсць чыстыя палякі. Гэтая жанчына вельмі прыемная асоба, тыповая яшчэ нашаніўка».

***— Нядаўна мы былі ў Маладзечне на канферэнцыі, прысвечанай беларускаму грамадскаму дзеячу, выдаўцу Аляксандру Уласаву. Яна праводзілася ў бібліятэцы імя М. Багдановіча, дзе ты працуеш, з тваёй ініцыятывы...***

— Усіх такіх канферэнцый было чатырнаццаць. Першую прысвяцілі Купалу. Мінулы год прапусцілі ў сувязі з пандэміяй. Гаварылі пра многіх... Вацлава Ластоўскага, Уладзіміра Караткевіча, Міколу Ермаловіча, Генадзя Каханоўскага, Пятра Бітэля, Максіма Танка, Рыгора Семашкевіча... Знакавыя постаці, стараемся выбіраць яшчэ і тых, якія маюць адносіны да нашага рэгіёна.

***— Вялікая частка тэкстаў двухтомніка прысвечана гісторыі беларускай школы, беларускага настаўніцтва... Тут таксама хапае дэтэктыўных расследаванняў.***

— Мне здавалася, што ў нас вельмі шмат постацяў, якія заслугоўваюць больш шырокага асвятлення, а пра іх ніхто не піша. І я пачаў шукаць пра такіх людзей звесткі ды пісаць сам. Напрыклад, пра педагога, публіцыста, грамадскага беларускага дзеяча міжваеннага часу Адольфа Клімовіча. Такія даследаванні патрабуюць вялікіх высілкаў. Спачатку трэба на магілку з'ездзіць, калі яна захавалася, — у выпадку з Клімовічам на Астравеччыне... І так звяно за звяном ланцуга раскручваеш. Я гэтых людзей завочна люблю. Перад тым як пісаць, углядаюся ў фотаздымак, асабліва ў вочы майго героя. Бо вочы не хлусяць. Паглядзіш — вось, пра гэтага чалавека хацелася б больш ведаць... Спачатку пра Клімовіча напісаў артыкул, тады ён вырас да кнігі. Тады захацелася яшчэ нешта дадаць. Тым больш жанрава ў мяне не вызначана «эцюд да партрэта». А эцюд — гэта нешта незавершанае.

***— Без цябе ніхто б не згадаў і Вячаслава Міхасёнка...***

— Безумоўна, не. Для мяне быў шок, калі нават у энцыклапедыі «Уладзімір Караткевіч» не знайшлося месца для згадкі пра Міхасёнка. Караткевіч столькі з ім ліставаўся, неаднаразова згадваў. Бываў у яго ў гасцях у Дубравах Маладзечанскага раёна, дзе Міхасёнак працаваў настаўнікам, выкладаў беларускую мову і літаратуру, і музыку, бо скончыў яшчэ і музычнае вучылішча. І жонка Міхасёнка была настаўніцай. Захаваліся фотаздымкі Караткевіча ў Дубравах, нават з жонкай туды прыязджаў. Прыязджаў і з Адамам Мальдзісам. Той дом, дзе ён гасцяваў, на жаль, згарэў, захаваўся толькі здымак, які зрабіў Караткевіч, а на зваротным баку ён падпісаў, маўляў, і дом яшчэ добры, і гаспадары добрыя. Караткевіч нават хацеў у дубраўскіх ваколіцах набыць лецішча. Калі нешта падпісваў Міхасёнку, там заўсёды прысутнічала слова «сябар». Міхасёнак таленавіты быў і як паэт. Праўда, гультаяваты. Каб пісаў шмат, мог бы сцвердзіцца ў літаратуры. Калі Вячаслаў Рагойша рыхтаваў першае выданне паэтычнага слоўніка, з падачы Караткевіча праілюстраваў артыкул пра адну з паэтычных форм вершам Міхасёнка «Хутары».

Парадаксальна, што той, хто бачыў Караткевіча ў салоне аўтобуса ці прысвяціў яму верш, у энцыклапедыі ёсць, а таго, хто ўваходзіў у кола блізкіх знаёмых ці нават сяброў, няма. Гэта выпадковасць ці заканамернасць? Трэба думаць, што хутчэй апошняе.

Міхасёнак напісаў добрыя ўспаміны пра Уладзіміра Караткевіча. Частка з іх пасля смерці аўтара друкавалася ў газеце «Літаратура і мастацтва». Ёсць другая частка, якая яшчэ нідзе не друкавалася... Там шмат цікавых побытавых дэталяў. Як Караткевіч паводзіў сябе ў той ці іншай сітуацыі, пра што гаварылі... Захаваліся ў архіве Міхасёнка малюнкі Караткевіча. Аднойчы ён прыехаў да Караткевіча з дырэктарам сваёй школы. Госці, відаць, добра выпілі і паблыталі шапкі. Дырэктар узяў Караткевічаву, а сваю пакінуў, бо падобныя, пыжыкавыя. І Караткевіч піша: «Слава, я цябе прашу, якнебудзь скажы дырэктару, каб мы з ім памяняліся шапкамі, а то мы выглядаем як на гэтай карцінцы». І намалявана: у Караткевіча на галаве шапачка маленькая, а дырэктар у шапцы аж з вушамі схаваўся. З прыемнасцю падрыхтую гэтыя матэрыялы для публікацыі на старонках «Звязды».

— Упэўнена, успаміны Вячаслава Міхасёнка будуць цікавыя нашым чытачам.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

***P.S.*** *У наступных нумарах шукайце публікацыі, падрыхтаваныя Міхасём Казлоўскім. Вас чакае ўнікальная магчымасць даведацца штосьці новае і нечаканае пра Уладзіміра Караткевіча.*

белагропромбанк
традиции будущего

Форма 1

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2021 г.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | 01.04.2021 | 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 225 424 | 253 022 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 288 | 268 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 925 365 | 900 988 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 530 894 | 246 010 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 3 275 221 | 3 024 836 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 7 346 468 | 7 624 250 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 4 | 128 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | 11071 | | 18 122 | 17 619 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | 11072 | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 45 859 | 43 674 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 441 132 | 444 086 |
| 13 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 223 | 239 |
| 14 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 7 369 | 7 047 |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 16 | Деловая репутация | 11121 | | - | - |
| 17 | Прочие активы | 1113 | | 159 154 | 167 081 |
| 18 | ИТОГО активы | 11 | | 12 975 523 | 12 729 248 |
| 19 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 20 | Средства Национального банка | 1201 | | 186 946 | 308 300 |
| 21 | Средства банков | 1202 | | 2 237 325 | 2 061 860 |
| 22 | Средства клиентов | 1203 | | 7 895 247 | 7 704 195 |
| 23 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 658 154 | 668 960 |
| 24 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 21 | 431 |
| 25 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | 110 | 556 |
| 26 | Прочие обязательства | 1207 | | 109 863 | 92 851 |
| 27 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 11 087 666 | 10 837 153 |
| 28 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 29 | Уставный фонд | 1211 | | 1 238 350 | 1 238 350 |
| 30 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 31 | Резервный фонд | 1213 | | 75 349 | 46 467 |
| 32 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 153 856 | 164 341 |
| 33 | Накопленная прибыль | 1215 | | 410 569 | 433 280 |
| 34 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | 12151 | | 1 878 124 | 1 882 438 |
| 35 | Доля неконтролирующих акционеров | 12152 | | 9 733 | 9 657 |
| 36 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 1 887 857 | 1 892 095 |
| 37 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 12 975 523 | 12 729 248 |

Форма 2

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках за январь – март 2021 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | 01.04.2021 | 01.04.2020 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 208 503 | 179 339 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 138 323 | 93 195 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 70 180 | 86 144 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 67 814 | 58 145 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 21 593 | 20 267 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 46 221 | 37 878 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 80 | 49 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 8 482 | 2 765 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 11 434 | 31 622 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (358) | 819 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 40 323 | 54 038 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 55 827 | 23 148 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 119 803 | 92 476 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 7 114 | 7 568 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 24 626 | 28 343 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 4 528 | 1 430 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 20 098 | 26 913 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | 30 | | 890 | 782 |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | 31 | | - | - |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 3 | | 20 988 | 27 695 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | 32 | | 20 874 | 27 197 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | 33 | | 114 | 498 |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | - | - |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

Председатель Правления А.А.Лысюк

Главный бухгалтер М.А.Шаповалова

Дата подписания: 27 мая 2021 г.

**Ссылка на публикацию: https://clck.ru/Va9HN**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

## Извещение о проведении 23 июля 2021 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
